V
Ба 49114

Л. БЭНДЭ

# ЯНКА КУПАЛА

## КРЫТЫЧНЫ НАРЫС

1932
ДВБ

Ба 49114

Л. БЭНДЭ

# ЯНКА КУПАЛА

КРЫТЫЧНЫ НАРЫС

Б 49114 д

1994 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

ЛІМ

МЕНСК 1932

Рэдактар *М. Лынькоў*
Тэхрэдактар *І. Белкін*
Здана ў друкарню 4-IV—32 г.
Падпісана да друку 8-VI 32 г.

25. 04. 2009

Заказ № 833. 3.000 экз. (3 арк.) Уп. Галоўлітбелу №а 150.

Друкарня імя Сталіна.

## АД АЎТАРА

Нарыс, які прапануецца ўвазе чытача, зьяўляецца дакладам, што чытаўся аўтарам 24 мая 1930 г. у інстытуце літаратуры БАН у час дваццаціпяцігадовага юбілею Купалы і дапоўнены ўрыўкамі з працы „да гісторыі беларускай літаратуры“. Выпускаючы ў сьвет і на суд чытача, гэты нарыс аўтар зусім ня думае, што цалкам вычэрпвае характарыстыку багатай і рознастайнай творчасьці Я. Купалы, якая чакае свайго дасьледчыка.

Аднак поўная адсутнасьць на кніжным рынку крытычнага матэрыялу аб Купале (як і аб іншых беларускіх пісьменьніках), вострая патрэба як для школ, а таксама і для шырокіх працоўных мас хаця-б агульнага агляду творчасьці беларускіх пісьменьнікаў, прымушае выпусьціць гэты нарыс, які аўтар амаль два гады не адважваўся выдаць асобнай кніжкай.

*Л. Бэндэ*

# I

Янка Купала поэта складаны і рознастайны, глыбока эмоцыянальны, высокай кваліфікацыі мастак. Зрабіць больш-менш поўны аналіз яго творчасьці зараз проста немагчыма, ды і наўрад ці магчыма, ці пад сілу гэта праца аднэй асобе. Для дасканальнага досьледу багатай творчасьці Купалы патрэбна праца колектыву на працягу значнага часу. Да таго-ж трэба дадаць, што яшчэ ня ўтвораны нават і прадпасылкі навуковага досьледу творчасьці Купалы.

Таму, па вышэйназваным прычынам, мы ня ставім сваёй задачай усебаковы аналіз творчасьці Купалы, а толькі хочам, наколькі нам гэта ўдасца,—ускрыць галоўныя мотывы яго творчасьці, высьветліць на фоне гістарычнага разьвіцьця—у якіх узаемаадносінах і ўзаемадзеяньнях знаходзілася творчасьць Купалы з тым гістарычным разьвіцьцём, што яго парадзіла, якую „купнасьць грамадзкіх адносін“ станавіў

і становіцы Купала, і ў якіх узаемаадносінах з пролетарскай сучаснасьцю зараз знаходзіцца творчасьць Купалы. Творчасьць мастака, поэта, пісьменьніка, як пэўны від дзейнасьці грамадзкага чалавека, ёсьць нішто іншае, як выражэньне пэўных рэальных грамадзкіх клясавых адносін у спэцыфічна-ўласьцівым тэй ці іншай творчай індывідуальнасьці—пераламленьні. Сама чалавечая асоба, незалежна ад яе грамадзкае значнасьці, ад яе ролі, заўсёды была, ёсьць і будзе продуктам грамадзкіх клясавых адносін яе часу. Яна, асоба чалавечая, яе думкі і пачуцьці не перастаюць быць продуктам гэтых адносін, нават і тады, калі яна сьвядома, ці несьвядома становіцца ў супярэчнасьць з адносінамі яе парадзіўшымі, калі яна адварочваецца ад абкружаючага яе асяродзьдзя, калі яна замыкаецца сама ў сябе, або ў нейкую „духоўную сутнасьць“. Больш таго: „сутнасьць чалавека—кажа Маркс—ня ёсьць абстракт, уласьцівы асобнаму індывідууму сваёй сапраўднасьці, яна ёсьць купнасьць грамадзкіх адносін“ (Маркс—тэзісы аб Фэйербаху).

Таксама і мастацтва пэўнай эпохі цалкам, творчасьць таго ці іншага пісьменьніка ў паасобку—заўсёды зьяўляецца продуктам абкру-

жаючай яго рэчаіснасьці, продуктам клясавай барацьбы, у такой-жа меры, як і продуктам творчага процэсу пісьменьніка „творца“. Зразумець у асноўных рысах і контурах творчасьць Купалы немагчыма без разуменьня тых гістарычна-грамадзкіх, клясавых адносін, у іх рознастайнасьці і антаганізьме, у іх разьвіцьці і конкрэтнасьці,—якія парадзілі і формiравалі Купалу, як поэта. Аднак мала разумець тое, што творчасьць пісьменьніка народжана поўнай купнасьцю грамадзкіх адносін, клясаваю барацьбою, што яна выражае клясавую барацьбу. Зьяўляючыся параджэньнем грамадзкіх адносін, клясавай барацьбы пісьменьнік, як і кожная актыўная чалавечая асоба, сваёй спэцыфічнай дзейнасьцю ўплывае, узьдзейнічае на парадзіўшыя яе грамадзкія адносіны, на сваю або іншую клясу, на об'ектыўную рэчаіснасьць. Сьвядомасьць ня толькі народжана быцьцём, але ў сваю чаргу і ўтварае быцьцё—гаварыў Ленін. Гэта значыць, што і літаратура, як пэўны від сьвядомасьці, будучы народжана грамадзкім быцьцём клясаваю барацьбою, у сваю чаргу зьяўляецца зброяй у клясавай барацьбе. І таму пры разглядзе творчасьці пісьменьніка яе нельга зразумець па-за яе соцыяльнай функцыяй.

Далейшай абсолютнай умовай, каб рабіць правільную ацэнку творчасьці Купалы, зразумець усю яго вялікасьць, сілу і бясьсільле, павінен быць выбар адпраўнага пункту, з якога разглядаць творчасьць нашага поэты. Немагчыма пазнаць творчасьць поэта з агульначалавечага пункту погляду. Чалавецтва падзелена на клясы, а клясы маюць процівалеглыя інтарэсы, клясы вядуць паміж сабою барацьбу, агульначалавечы пункт погляду ёсьць проста фікцыя, за якую хаваецца фэлістэр, падобны да пустой кішкі.

Немагчыма зразумець усю сутнасьць творчасьці Купалы і з пункту погляду тых ідэй і настрояў, якія знайшлі мастацкі сынтэз у яго творчасьці, як гэта робяць некаторыя дасьледчыкі.

Правільную ацэнку творчасьці Купалы магчыма зрабіць, карыстаючыся ўказаньнем Леніна адносна разуменьня творчасьці Талстога, „только с точки зрения... пролетариата“ (Ленін), як адзіна правільнай.

Толькі разглядаючы творчасьць і творчы шлях Купалы з пункту погляду разьвіцьця пралетарскага руху, з пункту погляду адпаведнасьці тых ідэй, пачуцьцяў і настрояў, што крысталізаваны ў творчасьці поэты, з ідэямі, рухам і барацьбой адзінае, пасьлядоўна-рэволюцыйнае

ні з чым непрымірымае клясы—пролетарыяту можна зрабіць правільную ацэнку.

Усякі іншы падыход, усякая іншая спроба ўскрыць асноўныя тычкі і мотывы творчасьці Купалы, няўхільна будзе не навуковай, аднабаковай, а часта, як гэта ў большасьці і ёсьць,—панігірычнай, або зусім бяспрынцыпнай. Варта хоць-бы спаслацца на агульна-гуманітарны падыход Л. Клейнборта*).

## II

Пачатак дваццатага стагодзьдзя ў был. царскай Расіі характарызуецца далейшым ростам капіталістычнага спосабу вытворчасьці як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы. Капіталістычныя адносіны настолькі ў гэты час шырока разгарнуліся, настолькі глыбока прасяклі амаль усе поры народнагаспадарчага організму, што ўсюды прышлі ў рэзкую супярэчнасьць з рэштамі прыгоньніцтва. Тэндэнцыя капіталістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі, якая ў асноўным вызначалася яшчэ ў палавіне XIX стагодзьдзя, набыла характар рэальнага

*) Глядзі яго „Молодая Белоруссия“, прадмову да „Сборника стихов“—Купалы.

пераможнага процэсу капіталізацыі земляробства. Гэты процэс капіталізацыі земляробства адбываўся адначасова як двухадзіны процэс. Стары фэодал-памешчык ператвараўся ў землеўласьніка-капіталіста, захоўваючы часта прыгоньніцкія формы эксплёатацыі. З другога боку пранікненьне капіталу ў вясковую вобшчыну раскідала патрыярхальныя гнёзды дробных вытворцаў—сялян,—на іх касьцёх узьнікаў вясковы эксплёататар—кулак.

Гэты процэс разгортваньня і пранікненьня капіталістычных адносін у глыбіню тагочаснай экономікі бязьлітасна парушаў руціну, закасьцянеласьць і цьвіласьць патрыярхальна-памешчыцкай краіны. Парушалася аселасьць і прыкаванасьць селяніна да яго „вузенькай палоскі“, хоць селянін аставаўся прыкаваным да вясковай вобшчыны. Разбураны процэсам капіталізацыі сельскай гаспадаркі і выкінуты са свайго адвечнага гнязда селянін ішоў на заработкі ў мястэчкі, гарады, далёка не паглынаючыся капіталістычнымі прадпрыемствамі таму, што тэмп разбурэньня і пролетарызацыі дробнага вытворца ішоў шпарчэй, чымся тэмп паглынаньня „вольных як птушкі“ ўчарашніх дробных уласьнікаў.

Гэты-ж працэс, які няўхільна быў зьвязан з працэсам звужэньня нават і зямельнай асновы дробнага селяніна, прымушаў яго ісьці ў Сібір у хадакі, „аблюбоўваць“ сабе новыя месцы „новую зямлю“. А калі ўзяць пад увагу сплаў лесу ў „Прусы,“ а таксама расійска-японскую вайну, вялікую эміграцыю, то ўсё гэта адбівалася на тэмпах якаснай зьмены селяніна. „На зьмену прыгоннай Расіі ішла Расія капіталістычная. На зьмену аселаму, прыросшаму да сваёй вёскі, селяніну, які верыў папом, баяўся „начальства“—вырастала новае пакаленьне сялян, якія пабывалі ў адходных промыслах у гарадох, якія навучыліся чаму-кольвек са свайго горкага вопыту і наёмнай працы. (Ленін).

Беларусь таго часу не зьяўлялася краінай буйнай прамысловасьці, яна была краінай дробнай, пераважна рамесьніцкай прамысловасьці, раскіданай па мястэчках і гарадох. Аднак ужо і ў гэты час працэс капіталізацыі памешчыка суправаджаўся ня толькі пераходам на капіталістычны спосаб вырабу сельскагаспадарчага продукту, але і насаджэньнем па маёнтках прадпрыемстваў індустрыяльнага характару, асабліва прадпрыемстваў па пераапрацоўцы сельскагаспадарчага продукту. А гэта ў сваю чаргу

формавала і концэнтравала новыя кадры рабочай клясы, павялічвала колькасьць і сілу наёмных рабоў. Ня гледзячы на параўнальную адсталасьць прамысловага разьвіцьця Беларусі, на невялікія, адносна, кадры пролетарыяту, раскіданага па дробных заводах і майстэрнях амаль усіх куткоў Беларусі,—ня гледзячы на гэта рабочая кляса, прыгнечаны і эксплёатуемы драпежніцкім капіталам рамесьнік, саматужнік зьяўляліся досыць рэальнай грамадзка-палітычнай сілай, супроць якой царызму не адзін раз прыходзілася пускаць казакаў і войска, не гаворачы ўжо аб атрадах паліцыі.

Рабочая кляса, вядучы барацьбу супроць самадзяржаўя і капіталістаў, „дапамагала мільёнам сялянства ўзьняцца, выпрастацца, скінуць з сябе звычкі „прыгонных рабоў“ (Ленін), і павяла іх на барацьбу „за зямлю“—супроць памешчыка, „за волю“—супроць самадзяржаўя.

Пачатак дваццатага стагодзьдзя азнаймаваўся досыць інтэнсыўным разьвіцьцём ня толькі рабочага але і сялянскага руху. За пэрыод 1900—1904 г.г. адбылося 31 рэволюцыйнае выступленьне беларускіх сялян супроць памешчыкаў, чыноўнікаў і айцоў духоўных.

Буржуазна-дэмократычная рэволюцыя 1905 г. адбывалася ў форме масавых рабочых стачак, палітычных забастовак, якія перарасталі ва ўзброенае паўстаньне—у горадзе, і масавага сялянскага руху, непасрэдна накіраванага супроць памешчычага зямляўладаньня... Рэволюцыйны пролетарыят пад кіраўніцтвам сваёй партыі,—партыі бальшавікоў, вядучы „дзьве розных і рознародных соцыяльных вайны“ *) (Ленін) абуджаў, уздымаў, „раскачваў масы“ сялянства і гарадзкой дробнай буржуазіі на агульнанародную барацьбу за свабоду (свабоду буржуазнага грамадзтва), за дэмократыю, г. зн. за самаўладзтва народу, за ажыцьцяўленьне непасрэдных мэт і задач буржуазна-дэмократычнай рэволюцыі.

---

*) У сучаснай Расіі—пісаў Ленін у 1905 г.—ня дзьве вядучых барацьбу сілы запаўняюць зьмест рэволюцый, а дзьве розных і рознародных соцыяльных вайны: адна ў нетрах сучаснага самадзяржаўна-прыгоньніцкага ладу, другая ў нетрах будучага, ужо нараджаючагася на нашых вачох буржуазна-дэмократычнага ладу. Адна—агульнанародная барацьба за свабоду (за свабоду буржуазнага грамадзтва), за дэмократыю, г. зн. за самаўладзтва народу, другая—клясавая барацьба пролетарыяту з буржуазіяй за соцыялістычную перабудову грамадзтва“ (Ленін, т. VIII, выд. I, ст. 255).

Паветы тагочасных беларускіх губэрань, як і паветы ўсёй Расіі, былі ахоплены сялянскімі хваляваньнямі, „сялянскімі бунтамі“ і рэвалюцыйнымі выступленьнямі. „Сяляне зьбіраліся групамі, абгаварвалі сваё становішча і мала-памалу ўцягваліся у барацьбу: натоўпам ішлі яны супроць буйных зямляўласьнікаў, палілі іх палацы і ўсадзьбы або адбіралі іх запасы, захоплівалі хлеб і іншыя жыцьцёвыя прыпасы, забівалі паліцэйскіх, патрабавалі перадачы народу зямлі вялізарных дваранскіх „поместий“ (Ленін).

Беларускі селянін пад кіраўніцтвам рабочае клясы павёў барацьбу „за зямлю“ супроць памешчыкаў—беларускіх, польскіх, расійскіх; „за волю“ супроць самадзяржаўя, супроць яго бюрократычнай сыстэмы і чыноўнікаў, да якой-бы яны нацыі не належалі. Праўда, у гэтым магутным сялянскім руху „за зямлю і волю“ было шмат стыхійнасьці, несьвядомасьці, цемры, дробнаўласьніцкай мяшчанскай лятуценнасьці, неразуменьня палітычнага сэнсу руху. Але „селяніну патрэбна зямля і яго рэволюцыйнае пачуцьцё, яго інстынкты, першабытны дэмократызм ня можа інакш выразіцца, як у накладаньні рук на памешчыцкую зямлю“ (Ленін). Беларускі селянін, батрак супроцьпаставілі сябе

памешчыкам, панам, незалежна ад іх нацыянальнага паходжаньня, як працоўныя эксплёататарам. Бо толькі ў магутным руху рэволюцыі: у рашучых бойках з самадзяржаўем кожная кляса, кожны слой пазналі сваіх і чужых, сваіх ворагаў і прыяцеляў.

Рэволюцыя „ўпяршыню стварыла ў Расіі з натоўпу мужыкоў, прыдушаных праклятай памяці прыгоньніцкім рабствам, народ, які пачынае разумець свае правы, пачынае адчуваць сваю сілу“ (Ленін).

Революцыя 1905 г. зьяўлялася буржуазна-дэмократычнай па сваім соцыяльным зьмесьце. Бліжэйшай мэтай, непасрэднай задачай яе было дасягнуць у рэволюцыйнай барацьбе дэмократычнай рэспублікі, 8-гадзіннага рабочага дня, конфіскацыі дваранскага зямляўладаньня.

Але своеасаблівасьць гэтай рэволюцыі заключалася ў тым, што яна разам з гэтым была і пролетарскай рэволюцыяй „ня толькі ў тым сэнсе, што пролетарыят быў кіруючай сілай, авангардам руху, але і ў тым сэнсе, што спэцыфічны пролетарскі сродак барацьбы, іменна стачка, прадстаўляла галоўны сродак раскачваньня мас...“ (Ленін).

Рабочая кляса, як найбольш рэволюцыйная,

найбольш пасьлядоўная, беззаветна адданая ў рэвалюцыйнай барацьбе „раскачвала масы“ сялянства, абуджала іх сваёй рэвалюцыйнай барацьбой, уцягвала іх у гэту барацьбу, кіравала імі, дапамагала ім дасягнуць непасрэдных бліжэйшых задач буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Але пролетарыят не абмяжоўваў рэвалюцыю вузка-буржуазнымі рамкамі, бальшавізм ня ўціскаў рэвалюцыю ў напасрэдна буржуазныя мэты, як гэта рабілі меншавікі. Для бальшавікоў ясна было, што „перамога буржуазнай рэвалюцыі ў нас немагчыма, як „*перамога буржуазіі*“ (Ленін). Таму „Мы ўсімі сіламі дапаможам усяму сялянству,—пісаў Ленін,—зрабіць рэвалюцыю дэмократычнай, каб тым лягчэй было нам, партыі пролетарыяту, перайсьці як мага хутчэй да новай і вышэйшай задачы— рэвалюцыі соцыялістычнай“.

У прамой сувязі з ростам і разгортваньнем рэвалюцыйнай барацьбы рабочае клясы ўзьнімаецца і разгортваецца і нацыянальна-вызваленчы рух нацыянальна-прыгнечаных народаў тагочаснай Расіі накіраваны сваім лязом супроць самадзяржаўя, супроць рэштак прыгоньніцтва.

Сапраўды, народная рэвалюцыя не абмяжоўваецца тым, што яна са зброяй у руках уздымае

мільённыя масы на барацьбу супроць старога ладу, але яна (рэволюцыя) абуджае прыдушаных, падспудныя творчыя сілы гэтых мільённых мас.

## III

Гэтыя соцыяльныя зрухі ўздымаюць і досыць інтэнсыўна ажыўляюць літаратурна мастацкі рух. На беларускай літаратурнай арэне зьяўляецца некалькі дзесяткаў пісьменьніцкіх імён, а таксама шмат твораў невядомых аўтараў, якія выяўляюць у мастацкіх формах імкненьні і жаданьні пэўных кляс, якія змагаюцца. Творчасьць гэтых пісьменьнікаў зьяўляецца зброяй у барацьбе іх клясы супроць другіх кляс.

Беларуская буржуазія, якая знаходзілася на этапе свайго фарміраваньня, консолідацыі і афармленьня ў выразную соцыяльную групу беларускага народу, мела найбольш закончаных сваіх мастацкіх прадстаўнікоў—Максіма Багдановіча, Ядвігіна Ш.

Абуджанае рэволюцыяй, актывізаванае барацьбой беларускае сялянства парадзіла выразьнікаў сваіх імкненьняў, жаданьняў, сваіх песьняроў з свайго асяродзьдзя.

Янка Купала і Якуб Колас зьявіліся першымі, найбольш гучнымі, найбольш дэмократычнымі, найбольш глыбокімі выразьнікамі пэўнай часткі настрояў і жаданьняў, сілы і слабасьці беларускіх сялянскіх мас, якія пачалі выходзіць на гістарычную арэну.

Купала распачынае сваю літаратурна-мастацкую дзейнасьць вершам „Мужык", надрукаваным у газэце „Северо-Западный Край" (мая 15 ст. ст. 1905 г.).

„Што я мужык, усе тут знаюць,
І як ёсьць гэты сьвет вялік,
З мяне сьмяюцца, пагарджаюць,—
Бо я мужык, дурны мужык".

Далей поэта паказвае становішча мужыка:

„Чытаць, пісаць я ня ўмею,
Ня ходзіць гладка мой язык,
Бо толькі вечна ару, сею,—
Бо я мужык, дурны мужык".

Вечна аручы і сеючы, здабываючы працаю хлеб свой, працуючы як вол рабочы, мужыку прыходзіцца зносіць лаянку, крык, рэдка сьвята ведаць. І ўсё-ж ня гледзячы на гэта:

Галеюць дзеці век бяз хлеба,
Падзёрты жончын чэравік,
Ня маю грошай на патрэбу,—
Бо я мужык, дурны мужык".

Намаляваўшы вобраз мужыка, яго гаротны стан, Купала гэты вобраз, гэтую характарыстыку цалкам і поўнасьцю адносіць і да сябе.

Купала ня лічыць сябе поэтам (мабыць у тым сэнсе, як разумеўся ў той час поэт, як нейкі звышчалавек, нейкае боскае стварэньне), а простым Янкай Купалай, сьпяваючы песьні „Убогай мовай".

„Я не поэта, о крый мяне божа!
Ня рвуся я к славе гэткай нямала,
Хоць песеньку-думку і высную можа,
Завуся я толькі—Янка Купала".

Песеньку-думку снаваць зьбіраецца Купала аб сваім народзе, аб бядзе, нядолі.

„Доляй убогі, ён ціхі, нясьмелы,
Бяда, яго мац', узгадавала,
Сьлёзы пагарды п'е толькі век цэлы...
Ат, ведама, просты Янка Купала".

Так характарызуе сябе Купала з выхадам сваім на поэтычную арэну. І ў гэтай засмучона-сатырычнай характарыстыцы адчуваецца тая горкая сапраўднасьць, што парадзіла Купалу. Калі зьвярнуцца да біографічных даных, то мы ўбачым усю праўду вышэйпрыведзе-

0 49114

ных радкоў пра радаслоўную Купалы. Купала выходзіць з напоўпролетарызаванай засьценкавай шляхты. „Да 21 году гаспадарыў дома, араў, касіў, сек дровы“—піша Купала ў сваёй аўтобіографіі. Але гаспадарыў не на сваёй зямлі, а на арэндаванай і „Гаспадарка на чужой зямлі надаела“. Пасьля гэтага Купала „праслужыў 3 гады ў броварах“ чорнарабочым, дзе, як ён кажа, зазнаў такога пекла, якога яшчэ ня меў. Толькі пасьля ўжо трох год работы ў броварах Купала „найшоў лёгкі хлеб“ на рабоце ў бібліотэцы потым, на курсах Чэрняева ў Петраградзе і, нарэшце, рэдактарам „Нашай Нівы“.

Песьні-думы поэта паводле яго ўласнага прызнаньня парадзіў:

„Дух збадзяны
У хатцы дзюравай,
На зямельцы акаванай,
Бязвольнай, бясправай“.

Каму-ж накіроўваць свае песьні-думы, паўстала пытаньне перад поэтам. Поэты пяюць свае песьні „Сытым і адзетым“, „кожны край“ кожны народ мае тых, што апяваюць яго, а беларусы, просты мужык, доляй убогі, з дзю-

равай хаткай, нікога ня мае. Дык каму-ж песьні—пытае поэт.

„Каму вас, песьні, я нясьмелы
Тут буду пець, снаваць з душы,
З душы няшчаснай набалелай,
. . . . . . . . . . . . .
Ці для тых цёмных, нешчасьлівых,
Што не патрапяць прачытаць,
Ці для тых сьветлых, а злаесьлівых,
Што не захочуць вас і знаць?“

Паставіўшы гэтае, так сказаць, програмнае, ці, як зараз кажуць, „пляцформнае“ пытаньне перад сваімі песьнямі, Купала вырашыў яго тым, што зьбіраецца сьпяваць свае песьні пра нядолю сваіх братоў—мужыкоў, чый „дух збадзяны“, хто жыве ў „дзюравай хатцы“. Купала зьбіраецца сваімі песьнямі:

„Тых будзіць, хто сьпіць,
Хто церпіць бяз віны“.

І з гэтым соцыяльным асяродзьдзем, з яго лёсам зьвязвае Купала лёс сваіх песень-думак.

Што-ж зьяўляецца об'ектам поэтычных песень-дум поэта з выхадам яго на поэтычную арэну, інакш кажучы, якая кляса тагочаснага грамадзтва выказвала свае пачуцьці, жа-

даньні і думы праз поэта, якой клясе служыць творчасьць Купалы.

Каб адказаць на гэтае пытаньне, трэба прасачыць творчасьць Купалы з яе пачатку, увесь той ідэолёгічны комплекс, які сынтэтычна прадстаўлен у песьнях Купалы.

Калі прасачыць за ўсімі вобразамі Купалы пэрыоду „Жалейкі“, як па вершах, што надрукаваны ў „Жалейцы“, так і ў тых вершах, што не ўвайшлі ў „Жалейку“, а надрукаваны пасьля, у зборніку „Спадчына“, то трэба прызнаць, што дамініруючым вобразам, дамініруючай пэрсонай, дамініруючым об'ектам Купалавай поэзіі зьяўляецца беларускі селянін-бядняк з яго вузенькай палоскай, а часта і безьзямельны, яго нужда, яго гора. Гэтаму вобразу праціпастаўлен, як антагоніст, другі вобраз, другі род пэрсонажаў, якія адпавядаюць тагачаснай рэчаіснасьці — пан, паліцэйскі, казна з яе падаткамі з беднага мужыка.

„Як цыган той, па сьвеце век цэлы бадзяюся
Бяз прытоньня, бяз родненькай, цёпленькай хаткі;
Над чужой працай з сіл маладых выбіваюся,
Сьветлай веры ў будучнасьць нікнуць астаткі“.

Гэта голас беларускага бедняка,ператворанага ў валацужнага, бадзяючагася, як

цыган па сьвеце, які над чужой працай з сіл выбіваўся.

Кругавід поэта заслан сьлязьмі, крывёю і бядой. „Кругом бачу і сьлёзы, і кроў, і бяду" ды яшчэ пан, што смокча сок з беднага мужыка, крычыць:

„Прэч з дарогі, мужык, абарванец ліхі".

За пэрыод „Жалейкі" Купала ўтварае рад крыштальных поэтычных вобразаў, абцягвае іх характарнымі і выразнымі дробязямі з гаротнага стану бядняцкіх слаёў беларускае вёскі. Найбольш закончаны, найбольш насычаны эмоцыяльна вершы, найбольш поўныя вобразы тыя, што ўзяты непасрэдна з абкружаючай яго рэчаіснасьці.

Каб пацьвердзіць гэта, мы спашлемся на высока-мастацкі для таго часу творчасьці Купалы верш „Зімою", адзначаны „1/II 1906 г.". Гэты верш па сутнасьці нагадвае будучыя поэмы Купалы, з уласьцівай яму стылізацыяй і надаваньнем новай якасьці народнай вуснай творчасьці. Калі не памыляюся, верш „Зімою" першая найбольш буйная спроба выкарыстоўваньня поэтай багатае беларускае народнае творчасьці.

Поэта апавядае пра долю „Прыгожай Ганулі"

„Гісторыя старая: убогая дзеўка
Пайшла ў двор на службу для хлеба куска,
Пайшла, паганяная гора прыпеўкай,
Ад хаты радзімай, сьвятога кутка".

Утварыўшы вобраз гаротнай Ганулі, поэта зьвязвае непадзельна сябе з гаротным жыцьцём Ганулі:

„Я ў песьню пральлю твае думы,
І разам сьпяём гулкім голасам
Пад дзікай мяцеліцы шум".

Поэта малюе патрасаючы вобразы бедняка, замучанага бядою да астатку, яго стан.

„Бядак жыве толькі сягоньня,
Дзён лепшых яму не чакаць;
Цар-голад няшчаснага гоне
Крывавага хлеба шукаць".
Пакінуўшы родную хатку,
Калі йшчэ такая дзе ё,
Замучан бядой даастатку,
Ідзе, каб здабыць на жыцьцё".

Купала стварае рад высокамастацкіх вобразаў гаротнага стану беднага мужыка-беларуса. У вобразах найбольш закончаных, найбольш насычаных эмоцыяльна Купала непадзельны ад

об'екту сваёй творчасьці, ад беларускага беднякa-селяніна, органічна зьліты з ім.

„Гора нам бедным, гора загнаным,
Мучаць нас чорныя долі,
Стогнем пад царам, стогнем пад панам,
Стогнем мы дома і ў полі.
Вечна ня знаем суду і права,
Цёмны народ мы сярмяжны.
Б'емся, працуем сьлёзна, крывава,
Едзе па карку нам кажны.
Нас самавольна земскі карае,
Душыць, саджае ў вадседкі,
Крыўдзіць вураднік, поп абірае,
Воласьць з нас цягне пасьледкі.
Гляньце: паліц'я, войска, вастрогі,
Цэрквы, чыгунка, палацы!—
Гэта наш труд, падаткі, налогі,
Наша мужыцкая праца.
Плача ў няволі край наш радзімы,
Самі-ж ня знаем спакою:
Паляць нас леты, студзяць нас зімы,
Мучыць нас голад вясною.

Творчасьць Купалы пэрыоду „Жалейкі“ ёсьць уваплашчэньне ўсіх бед, усяго гаротнага стану, усёй нужды, усёй горачы, усёй злосьці на сябе, і на абкружаючай рэчаіснасьці, протэсту рашучасьці і нясьмеласьці беларускіх бядняцкіх сялянскіх мас. Гэта сьцяўярджаецца ўсёй сыстэмай дамініруючых вобразаў, ідэалёгічнай накі-

раванасьцю, усімі нават формальнымі кампонэнтамі творчасьці Купалы за гэты пэрыод. Павольнасьць, а часамі нэрвовасьць рытму вершаў, засмучона-жаласьлівая няпэўнасьць, лексыка, мэтафора, усё цалкам і поўнасьцю адпавядае ідэолёгічнаму стану пэўнай часткі „нясьмелай“ беларускай беднаты таго часу. Гэта дае нам права вызначыць Купалу, пачатковага пэрыоду, як песьняра беларускай сялянскай беднаты, правільней было-б сказаць, што праз Купалу, як свайго мастацкага выразьніка, пачала гаварыць беларуская вясковая бедната, якая прачыналася ад вечнага сну і выходзіла на вялікую гістарычную арэну барацьбы за сваю долю.

Таму ні ў якім разе нельга згадзіцца і прымірыцца з думкай, што Купала толькі пераапрануўся ў вопратку беднаты, толькі браў вобразы з бядняцкага асяродзьдзя, але-ж ня быў песьняром беларускае беднаты, а прадстаўніком эксплёататаркіх кляс. Нельга згадзіцца з думкай, якую выказваюць некаторыя дасьледчыкі, што Купала пясьняр „сялянства наогул“. Сьцьвярджаць гэта, значыць наогул не разумець таго, што як пісьменьнік, так і творчасьць яго ёсьць параджэньне пэўнай клясы. „Сялян-

ства наогул“ ужо перад 1905 г. было неаднароднае, а падзеленае на пэўныя соцыяльныя групы, паміж якімі адбывалася ўжо і ў той час клясавая барацьба.

Купалу, як і бедняка таго часу не захаплялі пролетарскія соцыялістычныя ідэалы. Яго ідэалы так-жа абмежаваны як сама творчасьць пэрыоду „Жалейкі“.

Яго бядняк, як і сам поэта ня бачыць заўтрашняга дня свайго, ня бачыць, хоць і адчувае, што сёнешні бядняк заўтра пэратворыцца ў пролетарыя „Вольнага як птушка“. Таму ідэалы яго накіраваны не наперад, а назад. Ня заўтрашняе ён бачыць, а ўчарайшае; туды ён накіроўвае свае думы, пачуцьці, свае жаданьні. Яго ідэалы ня выходзяць з дробнаўласьніцкіх, наіўных, па сутнасьці, імкненьняў. Найбольш поўным, найболаш характарным у гэтым сэнсе зьяўляецца верш „Чаго нам трэба“.

„Трэба нам, трэба перш-на-перш хлеба“,
Хлеба, каб стала на цэленькі год,
Дроўцаў палена, конікам сена,
Капейку якую сабе на зварот.
Трэба нам, трэба, як сонца з неба,
Лепшы, даўжэйшы зямелькі шнурок,
Сытай скацінкі, новай хацінкі,
Каб красаваўся пры хатцы садок.

На сьвята скварку, часам і чарку,
Булкі і сыра гасьцей частаваць.
Цэлы адзетак, кніжак для дзетак,
Трэба нам школы па вёсках прыдбаць.
Роўнай дарогі, ботаў на ногі,
Мультану жонцы на лепшы каптан.
Жыць сьмела ў хатцы і не баяцца,
Каб не ганялі ў воласьць, у стан.
Доктара трэба, шпіталь нам трэба,
Дарма лячыліся-б дзе бедакі;
З торбай-жа ў старасьці каб ня цягнуцца,
Трэба ўстроіць прытулак такі".

Як відаць, гэты верш концэнтруе ў сябе цэлую програму патрабаваньняў, якія, аднак, ня выходзяць з рамак звычайных, перадрэволюцыйных дробнаўласьніцкіх патрабаваньняў сялянства, з круга якіх ня выходзілі ідэалы, надзея на рэстаўрацыю, штодня разараемых, беларускіх бядняцкіх мас. Імкненьне да „доўгага-доўгага шнуру з зялёным аўсом" часьценька сустракаецца ў творчасьці Купалы.

Шлях, па якім трэба пайсьці, спосабы, якімі дасягнуць лепшай долі для бедняка ў поэты ня ясны, ня выразны, не ўсьвядомлены, як не ўсьвядомлены ўсе прычыны беднасьці штодзеннага абяднеьня сялянскіх мас. Прычыны беднасьці поэта бачыў толькі ў існаваньні фэо-

дальна-памешчыцкай эксплёатацыі і казны, а шлях выхаду з існуючых умоў, часамі поэта бачыць у працы: „Працай усё зможам...“ і нядолю і няволю. А часамі поэта зварочваецца да таго, хто „вечна адзеты і сыты“, і заклікае яго „пашкадаваць мужыка“.

„Пашкадуй-жа ты, брат, мужыка,
Каб яму было жыць весялей!
Пашкадуй—не адсохне рука,
Пашкадуй, не чакай, а хутчэй“.

Ну, а калі-ж гэты „вечна сыты і адзеты“, „брыты“ не пашкадуе, тады „на сьвет многа прыдзе бяды“.

„Бо за крыўду сваю адамсьціць,
Сьвіньням будзе крыві не пабраць—
Адамсьціць аж зямля задрыжыць,
Аж віхры зашумяць, загудзяць“.

Гэтая, здавалася-б, страшная пагроза, па сутнасьці ёсьць толькі ўзмах кардоннага мяча, рукамі ўнутрана ўзбунтаванага, але нясьмелага Купалы. Гэта ня ёсьць, ні ў якім разе, прызыў да сапраўднае расправы з тымі, хто „вечна сыты і адзеты“.

Рэволюцыя, рэволюцыйная барацьба, якую пад кіраўніцтвам рабочай клясы вяла перадавая частка сялянства ў 1905-6 гг., не знайшла

домініруючага панаваньня ў творчасьці Купалы. Яе мейсца займае плач, скарга, просьба да тых, хто „вечна адзеты і сыты“, „пашкадаваць мужыка“, часамі пагроза, надзея на будучыню. Песьні больш напоўнены плачам і скаргамі.

„Бо ў песьнях шмат скаргаў на хціўцаў нясецца,
А ў скаргах бяздольных шмат праўды чуваць“.

Песьні пранікнуты горкаю праўдай, констатаваньнем, адлюстраваньнем долі бедняка. Адчак гарачае соцыяльнае паветра рэволюцыйнага часу іншы раз дула і на поэту. Як-бы ў адказ на подыхі гэтага рэволюцыйнага паветра, поэт прысьветчыў некалькі сваіх вершаў вясьне чалавечай, што пахавае „наша гора, як сьнег, як завею“. Перш за ўсё трэба адзначыць тую характарыстыку, якую дае Купала вёсцы: „Вёска... заліта людзкімі сьлязамі“, у ёй „горка пакрыўджаны плача“, але-ж:

„Занадта сьляпы люд, занадта ба[illegible]
Каб мог ён за крыўду сваю заступіцца.
Праз тое і вёску так хваляць поэты,
Найболей такія, што, зьеўшы катлетаў,
Віном якім смачным катлет той закусяць;
О, гэткія, пэўна, аб шчасьці пець мусяць.

Даўшы такую характарыстыку вёсцы і „сялянскім“ поэтам, Купала спадзяваўся, што

ёсьць на сьвеце вялікая праўда, якая за сваё паніжэньне адплаціць людзям.

„Але ёсьць-жа вялікая праўда на сьвеце,—
Праўда сілаю роўная сонца агням,—
Цяпер сьпіць, але ўстане і бляск свой расквеціць,
За сваё паніжэньне адплаціць людзям...

І ў поэты запальваецца сьвятло надзеі, што гэтая праўда неўзабаве прыдзе і чалавек стане ня толькі душою вольны, бо:

„Нам есьці хочацца тым болей,
Чым болей голад прыгняце,
Тым рвемся больш мы і да волі,
Чым меней, к нам яе ідзе".

І таму што-б ні рабіла чорная сотня, якія-б спосабы ня ўжываў дэспат, усё-ж ня змогуць прымусіць чалавека быць нявольным душою.

„Дарэмна сьвісткамі нагаек
Застрашыць хочуць тыраны,
Нагнаўшы чорных соцен шаек,
Акулі рукі ў кайданы.

. . . . . . . . . . . . .

Ня страшны мне Сібір, вастрогі,
Меч катні над шыяй маёй,
Хоць і скуюць мне рукі і ногі,
Хоць зрэнкі выдзяруць з вачэй.

. . . . . . . . . . . . .

Дарэмна гіканьне нясецца
Дэспатаў подлых над зямлёй,
Што воля ў путы акуецца,
Згняцецца сілаю, пятлёй.
. . . . . . . . . . . . .
Ці-ж людзі сонца згасіць могуць,
Згасіць, як сьвечку, яснасьць дня
І волю-ж дэспаты ня змогуць,
Бо воля сонейку раўня".

Як відаць гэтая „песьня вольнага чалавека" напісана ў час разгрому, прыдушэньня царызмам рэволюцыі 1905 г., яна, мабыць, адносіцца да вясны, лета 1906 г. Мы яе ўзялі для таго, каб паказаць, наколькі поэт закахан у волю, наколькі моцнае жаданьне волі.

Барацьба за волю там сям захапляе поэту. Ідзе вясна-рэволюцыя, якая:

„Невясёлыя думы і сны разганяе,—
Ажна хочацца жыць усей душой".

Купала вітае гэтую вясну чалавецтва бадзёрым настроем і прыветлівай песьняй. Аднак бадзёры настрой, прыветлівая песьня рэволюцыі абмяжоўваецца сузіральнымі адносінамі да рэволюцыі, а не актыўна дзейнымі.

„Ах, так хочацца жыць і жывую надзею
Калыхаць у душы, думку сьніць аб адным;
Што вясна наша гора, як сьнег і завею
Пахавае ў рацэ, спале сонца агнём".

Праўда інагды пад такі бадзёры настрой поэт, захапіўшыся гэтым „вясеньнім“ настроем, заклікае касца „з калоды ўстаць“ і пайсьці за лепшую долю на барацьбу:

„Пяюць птушкі пад вакном,
Лепшай долі даўно жджом...
Ну, досьць коску ўжо кляпаць,
Час з калодкі ўставаць.
Гоп, гоп, гоп,
Час ужо ўставаць“.

Таксама некалькі вершаў, якімі распачынаецца „Гусьляр“, гучаць больш-менш актыўна. Але-ж гэтыя частковыя бадзёрыя і прызыўныя настроі поэты не зьяўляюцца асноўным кірункам як „Жалейкі“, так і „Гусьляра“. Актыўны рэволюцыйны настрой зьяўляецца другарадным настроем, другарадным, так сказаць, пабочным элемэнтам у творчасьці Купалы пэрыоду „Жалейкі“, а таксама і „Гусьляра“, пра якіх будзе гутарка ўперадзе.

Агульны тонус творчасьці Купалы за той час неактыўны, а пасыўна-сузіральны, з рознастайнымі настроямі, з вузкім колам абмяжованых дробнаўласьніцкіх імкненьняў — сялянства, насычаны скаргаю, плачам, жальбою і калі-ні-калі

„сьветлай верай і надзеяй“. „Душа ные, а болем уздымаюцца грудзі“.

„Роднай песьняй“ усё-ж астаецца песьня „ў суме і ў горы“, у якой „адбіваецца нядоля і доля“, „уздыханьні, што ходзяць з сахою, з сякераю, і холад, і голад, няволя і воля і ў будучнасьць ясну надзея і вера“. І гэта мае сваю пэўную законамерную прычыну. Умовы жыцьця самога поэты ў час выхаду яго на поэтычную арэну, напоўжабрацкае становішча бядняцкіх беларускіх мас, ідэолёгічная накіраванасьць і імклівасьць абкружаючай яго штодня разараемай і ўнутрана бунтуемай, але „ня сьмелых“, каб узьняцца на рэволюцыйную барацьбу, а таму плачучай часткі—бядняцкіх мас—і ўсё гэта зьявілася адпраўным, выточным матэрыялам для яго творчасьці.

У творчасьці Купалы знайшлі сваё высокамастацкае адлюстраваньне псыхолёгічныя пераживаньні і імкненьні тэй часткі беларускага сялянства, якая адчула і ўсьвядоміла, убачыла непасрэдныя прычыны свайго гаротнага стану (фэўдальна-памешчыцкую эксплёатацыю), але якая далей скаргі, плачу, дробнаўласьніцкіх лятуценьняў, прымітыўных, наіўна соцыялістычных жаданьняў зрабіць усіх роўнымі, ураў-

няць багатага з бедным, беднага з багатым—не пайшла. Ды і поэт ня ўздымаецца вышэй гэтых непасрэдных настрояў, вышэй варыяцыі псыхікі гэтай соцыяльнай групы.

Актыўная рэволюцыйная барацьба, якую вяло ў 1905 і 1906 г. г. сялянства разам з рабочай клясай, пітала некаторыя надзеі ў „Сьветлую будучнасьць“ у гэтай часткі сялянства. Заражаліся гэтыя надзеі, вера і ў поэта. Але як гэты пласт беднаты не асьмельваўся падняцца на барацьбу, так і поэт не сьпяваў пра яе, не заклікаў на актыўную дзейнасьць, каб перабудаваць уласнымі сіламі сваё гаротнае жыцьцё.

Як плакаў забіты, цёмны селянін-бядняк, так і плакаў поэт, плакалі яго песьні, губілася ўсякая надзея на будучыню, пакрывалася ўсё змрокам.

„Плачаце вы, песьні,
І я з вамі плачу.
Хацеў-бы вас, песьні,
Зрачыся, пакінуць,—
Сілачкі-ж мне мала,
Буду ўжо так гінуць“.

Паэта ўпадае ў нявер‘е, што прыдзе лепшы час, калі можна будзе „весела запець“. Поэт замыкаецца ўнутры сябе, адрываецца ад жыцьця і нават ад об‘ектаў сваіх песень. Сам поэт

і яго песьні робяцца тым об'ектам, які аплаквае пясьняр.

„І так мне здаецца
Колькі ні тужыці
Са мной вы, я з вамі
Вечна будзем жыці".

Кажа ён зварачаючыся да сваіх песень.

Нават там, дзе Купала выступае ад імя свайй асобы, дзе ён выказвае свае асабістыя жаданьні і хаценьні, ён ня ўздымаецца на вышыню політычных патрабаваньняў свайго часу, на вышыню задач політычнай барацьбы, якую ў той час вяла рабочая кляса і перадавая частка сялянства.

„Дык-жа знайце, чаго-б я хацеў,
Аб чым думачкі толькі мае:
Каб мой люд маю песьню запеў
І пазнаў, аб чым песьня пяе!"

А песьня-ж яго не заклікала на рэволюцыйную барацьбу, ня ўздымала і не актывізавала люд сваім сумам і мінорнасьцю. Песьні пра нядолю, пра няволю зьяўляліся не актыўна-дзейнымі, а пасыўна-сузіральнымі, а таму і сіла іх знаходзілася ў адваротных адносінах да рэальнай барацьбы працоўнага сялянства ў пэрыод 1905—7 г. г.

Купала абагульвае настрой і адданьні пэўнага слою сялянства, прадстаўніком якога ён зьяўляецца. Прадстаўляе гэтыя псыхолёгічныя перажываньні і жаданьні, плач і скаргу за агульна-народныя жаданьні за настроі „душы беларускай“.

І Купала робіцца волатам там, дзе ён абмалёўвае жыцьцё селяніна, нядолю і няволю краіны, уся сіла яго ў гэтым, у вобразе гаротнага стану працоўнага беларуса, хоць і не заўважае тых клясавых супярэчнасьцяй, якія ўжо існавалі ўнутры беларускага сялянства. Купала малюе шматгранны вобраз бядняцкай Беларусі, адначасова не заўважаючы клясавых супярэчнасьцяй у беларускай вёсцы, затушоўвае рэальныя ўнутраныя процэсы, хоць і скажае рэчаіснасьць. Там-жа, дзе Купала імкнецца найці выйсьця з абмаляванага ім гаротнага паднявольнага стану працоўных, там Купала бясьсільны, бездапаможны. Месца рэальнай барацьбы, якую вяла перадавая частка сялянства з існуючымі ўмовамі свайго існаваньня, у творчасьці Купалы займае скарга, плач, надзея, сьветлая вера, а не актыўны заклік на барацьбу.

Дзе-ж прычыны таму, што поэт, малюючы патрасаючыя вобразы становішча беларускага

селяніна, няшчаснай старонкі яе—цемру, забітасьць, нужду і роспач,—ня клікаў люд сваёй старонкі на рэволюцыйную барацьбу супроць існуючых умоў, за лепшую будучыню, у якую „сьветлай верай“ часамі нікнуў поэт? Ці можа поэт сьвядома не хацеў сьпяваць так, каб уздымаць сваёй песьняй „люд прыдушаны і скуты“ на ўсенародны сход? Не, прычына ня ў тым, што поэт не хацеў сьпяваць заклікаючых, актыўна-дзейных песень, справа не ў суб'ектыўным жаданьні, або нежаданьні. Купала занадта любіў свой люд, сваю старонку, каб сьвядома ня пець актыўна-дзейных песень, каб не заклікаць на барацьбу. Гэта па-першае, а, па-другое, прычыну трэба шукаць не ў суб'ектыўных жаданьнях, ці нежаданьнях, а ў об'ектыўнай рэчаіснасьці.

Прычыны сумнасьці яго песень ляжаць у тым сумным матэрыяле, з якога ён тварыў свае песьні, у суме, у бязрадасным жыцьці і настроі, у сумным адчуваньні тых працоўных мас, якіх апяваў Купала ў сваіх песьнях:

„І б'юся-ж напрасна,
Як рыба аб лёд,
Ад долі няшчаснай
Няма мне варот“. (Спадчына).

У тым, што сьветапогляд Купалы ня ўзьняўся вышэй об'екту яго, ня ўзьняўся на ўзровень рэволюцыйнай клясы.

Купала шукаў праўды, шукаў долі, шукаў варот ад нядолі, як бедны мужык, што з кожным днём усё больш і больш разараўся, што судзіўся з панам, але не знаходзіў той праўды, а таму ахапляў яго сум, беспрасьветнасьць, ажно да згубы часамі веры і надзеі, што калінебудзь знойдзена будзе праўда і доля, але вышэй гэтага ня ўзьнімаўся.

У той час, як перадавая частка сялянства разам з рабочай клясай вяла рэволюцыйную барацьбу супроць існуючай рэчаіснасьці Купала, папаўшы ў асяродзьдзе нашаніўцаў, адрываецца па сутнасьці ад тых мас, якіх аплакваў у сваіх песьнях, а ў сілу гэтага ня прымыкае да жывой рэволюцыйнай практыкі працоўных мас і таму ня ўлаўлівае павышаную пульсацыю актыўнай дзейнасьці перадавой часткі працоўнага сялянства, а таму і настрой яго ліры быў не заўсёды сугучны перадавой частцы сялянства, што вяло рэволюцыйную барацьбу.

„За ніякія справы ні разу ня судзіўся",— кажа пра сябе Купала ў сваёй аўтобіографіі. І гэта праўда. „Наша ніва", як і яе ўдзельнікі,

стаяла ў старане ад рэволюцыі, а таму судзіць іх было незавошта.

Больш таго. Купала ў сваёй творчасьці пэрыоду „Жалейкі“ пачаў апяваць учарайшы дзень селяніна, каб потым апяваць і ў ружовых фарбах маляваць мінулае, як кажуць, „залаты век Беларусі, а пра будучыню забыць. Узьняўшыся „над сваёй айчынай“, поэта зварочваецца да бога*) і пытаецца ў яго:

„Дзе той час, у якім
Тут кіпела жыцьцё?
Свой народ быў кругом
І любіў сваё ўсё!

. . . . . . . . . . .

Весяліўся народ,
Аж грымела сяло!
Ва ўсіх сьветлы паглёд,
Ва ўсіх шчасьце цьвіло.

Такі настрой поэта, захапленьне мінуўшчынай, „залатым векам“ Беларусі, сьведчыць аб тым, што буржуазная ідэолёгія ў нашаніўства ўсё

---

*) Пад гэтым вершам рэдакцыя I тому збору твораў дае жартлівую заўвагу: „зварот поэта да нейкага „бога“, які быццам „стварыў сьвет“—ёсьць ня болей, як поэтычны зварот. Біблейская казка аб стварэньні сьвету богам зруйнавана сучаснай навукай і адкінута назаўсёды. Вось сапраўды: „Скажи мало, зато здорово“. (Пруткоў).

больш і больш ўплывалі на поэта, каб нарэшце прышчапіць лібэральна-народніцкія погляды і на выйсьце з таго соцыяльнага тупіка, у які загнаны працоўныя масы роднай старонкі.

„Эй, каб цёмен ня быў,
Чытаць кніжкі ўмеў,—
Я-б і долю здабыў,
Я-б і песенькі пеў!“

Асьвета, уменьне чытаць кніжкі, вось тое, што пазбавіць мужыка ад нядолі ад нярадасьці, дасьць долю, волю і магчымасьць песеньку пяяць.

Разам з гэтым Купала часамі высоўвае на першы плян „родненькую мову“, бярэ беларуса як нейкую адзінасьць, не дыфэрэнцыруючы яго на соцыяльныя групы, супроцьстаўляючы беларуса як свайго чужому не-беларусу, суседзяўжа заклікае не сварыцца, жыць у ладу, любіцца:

„Любімось, мае суседзі!
Кіньма сваркі, звадкі;
Жыйма, як родныя дзеці
Аднэй нашай маткі!“

Што-ж датычыцца роднай мовы, то Купала заклікае беларуса ня чурацца „сваёй роднень-

кай мовы“ і папракае зласьліва селяніна беларуса, што той сьвінку ставіць вышэй мовы:

„О, я знаю: сэрца маеш
Бо па сьвінцы нават плачаш,—
А што мовай пагарджаеш,
Дык гэтага і ня бачыш“.

Захапіўшыся мовай самой па сабе, адарваўшы пытаньне мовы, а разам з гэтым і нацыянальнае вызваленьне ад пытаньняў барацьбы супроць самадзяржаўя і памешчыкаў, Купала не заслужона папракае селяніна, што ён па сьвінцы плача, а мовай пагарджае. Для селяніна, чый вобраз так мастацка абмаляваў поэт у сваей „Жалейцы“, у той час сьвінка была больш важнейшай справай, чымся пытаньне мовы, бо сьвінка зьяўлялася іменна тым, што падтрымлівала і так напоўжабрацкае існаваньне селяніна-бедняка. Упікі-ж Купалы селяніну сьведчаць аб тым, што Купала адарваў нацыянальнае вызваленьне ад вызваленьня клясавага, не ўсьвядоміў іх адзінства, узяў нацыянальнае вызваленьне само па сабе як нейкі абстракт, і об‘ектыўна загаварыў языком сытага нацыянала-буржуа, якому ня прыходзілася клапаціцца і плакаць па сьвінцы.

Праўда, такія народніцка-лібэральныя, нацыянал-буржуазныя настроі, як ідэалізацыя мінуўшчыны, як выпячваньне на першы плян і вышэй за ўсё нацыянальнага моманту не зьяўляюцца характарызуючымі для тагачаснай творчасьці Купалы. Яны былі навеяны тым нацыянал-лібэралізмам нашаніўства, у атмосфэры якога знаходзіўся Купала.

Ідэолёгі беларускай буржуазіі ў тым ліку і літаратурна-мастацкія імкненьні і барацьбу буржуазіі за свае сугуба-клясавыя інтарэсы абцягвалі рознай ідэолёгічнай мішурой. Гэтай ідэолёгічнай мішурой часта была вопратка сярэднявякоўя, у якую апраналіся эксплёатацкія інтарэсы буржуазіі.

Вопыт усёй гісторыі буржуазіі паказвае, што ў руху да свайго панаваньня буржуазія праз сваіх ідэолёгаў нацягвае на сябе вопратку мінулага, пераймае традыцыі былых часоў.

„Традыцыя ўсіх памёршых пакаленьняў як жахлівая здань гняце мозак жывых. Якраз у той час, калі людзі намагаюцца, каб радыкальна ператварыць сябе і акружаючы іх сьвет, намагаюцца стварыць нешта, ніколі яшчэ не існаваўшае—якраз у такія эпохі рэволюцыйных крызісаў яны заклапочаны выклікаць на дапа-

могу сабе здані мінулага, бяруць у іх імёны, баявыя паролі, касьцюмы, каб у гэтым сьвечаным вякамі адзеньні, гэтай перанятай у продкаў мовай разыграць новую дзею на сусьветнай гістарычнай сцэне“ (Маркс).

І далей Маркс піша: „Але пры ўсёй характарызуючай буржуазнае грамадзтва адсутнасьці героізму, ёй патрэбен быў героізм самаахвяраваньня, тэрор, каб зьявіцца на сьвет, і для гладыятараў буржуазнага ладу клясычна-строгія традыцыі рымскай рэспублікі давалі тыя ідэалы, тыя мастацкія формы і сродкі самаашуканства, якія ім былі патрэбны, каб захаваць ад саміх сябе буржуазна-абмежаваную сутнасьць сваей барацьбы і падтрымліваць свой энтузіязм на вышыні вялікай героічнай трагэдыі“. Нешта ў мініятуры падобнае разыгрывалі і клёўны беларускага нацыянал-адраджанізму, часамі патрасаючы жабрацкаю торбай беларускіх сялян, як штандарам, каб сабраць навакол сябе народ, а на самай справе стваралі комічнае відовішча сваёй няздольнасьці зразумець рэальны ход гісторыі.

Уздыхі ідэолегаў беларускай буржуазіі пра мінулае, ідэалізацыя гэтага мінулага было па сутнасьці нічым іншым, як практыч-

най праграмай будучага, але прыкрытай архаічнай мішурой, а ў гэтым выглядзе ідэалізаваная мінуўшчына зьяўлялася спэцыфічным сродкам клясавай барацьбы беларускай буржуазіі супроць рэволюцыйных народных мас.

Што-ж датычыцца выпячваньня мовы на першы плян, то гэта ўласьцівасьць неадменна ад клёўнаў вялікай гістарычнай драмы. „Буржуазія заўсёды на першы плян ставіць свае нацыянальныя патрабаваньні. Ставіць іх бясспрэчна. Для пролетарыяту яны падпарадкаваны інтарэсам клясавай барацьбы“ (Ленін). Нацыянальныя інтарэсы для селяніна таксама былі падпарадкаваны інтарэсам барацьбы з самадзяржаўем, з памешчыцка-фэўдальнай эксплёатацыяй.

Ды і для Купалы ў пачатку яго творчасьці нацыянальныя інтарэсы, нацыянальнае вызваленьне было непарыўна, непадзельна з вызваленьнем ад тых умоў, у якіх знаходзіліся пакрыўджаныя, худыя, у горы і бядзе, апранутыя ў лапці— беларусы, якія хочуць звацца людзьмі.

Варта хоць-бы спаслацца на патрасаючы верш „А хто там ідзе“.

Купала ў пэрыод „Жалейкі“ яшчэ не разгарнуў як стаць сваіх політычных ідэалаў. Воля, што займае значнае месца ў творчасьці Купалы,

для яго нейкі абстракт, нейкі абсолют сілай роўны з сонцам. Ён яшчэ блудзіў па пуцявінах прымітыўных, дробнаўласьніцкіх лятуцеаьняў.

„Жалейка“ зьявілася асноўнай клеткай, з якой разьвіўся ўвесь Купала. Ужо „Жалейка“ ў пачатковым відзе мела амаль усе элемэнты далейшай творчасьці Купалы. Аднак асноўны пасьледуючы мотыў, вызваляючы актыўна дзейны характар творчасьці, разгарнуўся пасьля пэрыоду жорсткай дэпрэсіі ў творчасьці поэты, выкліканай рэакцыяй.

## IV

1906—9 г. г. зьяўляюцца гадамі жорсткай барбарскай рэакцыі. У разбродку дзейнічаючыя сілы рэволюцыі былі зломлены. Рэакцыя сьвяткавала сваю перамогу над рэволюцыяй. Сталыпін вяроўкамі наводзіць парадак у краіне і прускімі бюргерскімі мэтодамі завяршае буржуазную рэволюцыю.

Буржуазія кінулася ў абдымкі самадзяржаў‘я, супроць якога ўчора махала кулакамі. Рэволюцыйны пролетарыят пераварыў свой вопыт і рыхтаваўся да новых, больш рашучых боек. Дробная буржуазія, запалоханая рэакцыяй, праклінала на чым сьвет „пракляты пяты год“,

яе інтэлігенцыя сьпяшалася адракчыся ад свайго мінулага рэволюцыйнага, „заражала грамадзкую атмосфэру ўныньнем, маладушшам, рэнегацтвам“ (Ленін).

Беларускія „адраджэнцы“ расьпінаюцца за хутары і пішчаць пра асьвету „сярмяжнага, гаротнага брата-крывічаніна“.

„Гаротны, сярмяжны брат-крывічанін пад націскам форсіраванага насаджэньня капіталізму і зьверху і зьнізу губіў апошнюю стаць зямлі, яго патрыархальнае гняздо раскідвалася капіталізмам, а ён самператвараўся ў кадравы склад рэзэрвнай арміі. Абвастраліся і клясавыя супярэчнасьці ўнутры вёскі, унутры „сям'і беларускай“.

У атмосфэру „ўныньня“, маладушша, трапіў і Купала. „Гусьляр“, частка „Шляхам жыцьця“ носяць глыбокія сьляды ўныньня, маладушша, бязьвер'я, беспрасьветнасьці, пазбавіцца ад якой заклікаў раней поэт, часамі і дэградацыі асобы поэта.

У формальна-тэхнічных адносінах Купала робіць у „Гусьляры“, а таксама і асабліва ў „Шляхам жыцьця“ досыць вялікі крок уперад, але ў ідэолёгічным сэнсе „Гусьляр“ значны крок ад „Жалейкі“ назад. Трапіўшы ў вышэй-

паказаную атмосфэру і Купала далей адыходзіць ад жыцьця і ад об'ектаў сваей творчасьці беднага, забітага, цёмнага беларускага селяніна. Поэт рвецца:

„К зоркам агністым, к прывольлю нябеснаму,
Вырваўшы з ціны жыцьцёвай душу,
Мчыся, ня дайся, цярпеньню балеснаму,
Горда пакінь земляную глушу",

бо „там хэрубіны спаткаюць цябе" і „будзе на сэрцы спакойнасьць вялікая".

Купала, як ува сьне, блудзіць па жыцьцёвым пуцявінам, кідаецца з аднаго об'екту на другі, і толькі:

„А як да магілак прыдзем:
Крыж, каля крыжа бадылі,
І тут мы толькі і відзім
Як-жа здарма век блудзілі"*).

Поэта ахоплівае гэты магільны, халодны настрой. Ён часта да яго зварочваецца як да адзінага канца ў жыцьцёвым блуканьні:

„Дзён вясёлых мне ня знаці
Да самай магілы",

*) „Наша мінуўшчына" рысуецца поэту на гэтай стадыі творчасьці ўжо ня ў гэтакіх ружовых фарбах як раней.

„Мы ня жылі, як жывуць людзі,
Гасьцінцам славы не хадзілі,
Ня зналі ўцехі нашы грудзі,
Вянкоў мы славы не насілі".

Стоячы на могілках, поэт у сэрцы думку калыхае:

„Ганю ад жыцьёвага шуму
Ў загробны край сваю душу“.

Ён зьбіраецца зыйсьці з нудой і бядой у магілу.

„Так цяжка жыць паміж жывымі,
Ў магіле будзе мо‘ лягчэй“.

Поэт плача па замучанай старонцы, ходзіць хмуры з хмурымі думкамі і бездапаможна пытаецца—ці ўзойдзе калі сонца чалавецтва, ці знойдзецца калі праўда і доля:

„З плачам думка-песьня льлецца
Па замучанай старонцы,
З плачам рэха адаб‘ецца...
Ці ты ўзойдзеш калі, сонца?
Ці ты ўзойдзеш?“

Замест сонца поэту

„Навяртаюцца на вочы
Сьлёзы, як раса,
Сьветлых думак гнаць ня хоча
Маладосьць краса“.

А замест сьветлых думак

„Лятуць толькі думкі з даля
Хмурныя, як я“.

Аднак, калі некалі поэту прыходзяць другія думкі, якія ён заклікае граць з вераю

шчасьлівай, зьменным людзям і сьвету, зайграць як калісьці ігралі на жалейцы:

„Эх, вы, мае думкі,
Устаньце, ачуняйце!
Хоць вам мо' і цяжка,
Як калісь, зайграйце!'

Але-ж замест уздыму ад магільных песень, ад хмурых думак, поэта заводзіць бяседу ў шынку, дзе свой і ня свой робіцца братам.

„Годзі маркоціцца, хлопцы, дзяўчаты
Дружна падходзьце к сталу во сюды!
Будзем гуляці—шынкар наш багаты,
Дасьць чым пацешыцца, дасьць, як вады.
Гэй, грамадой
Засядзьма ў радзі
Свой, ці ня свой—
Нам кожны брат,
Будзьма аднэю сям'ёй".

Поэт заклікае піць каб уздрыгнуў зьдзіўлены сьвет, жыць сёнешнім і ня думаць аб тым, што „заўтра" нясе.

„Жыйма сягсняшнім шчыра ў волю,
Плюйма на тое, што „заўтра" нясе".

Каб уявіць сабе ўпадак надта варта параўнаць вышэйпададзеныя вытрымкі з вершу „Бяседа" з вершам „Гарэлка" ў пэрыод „Жалейкі",

дзе да гарэлкі Купала падыходзіць з гуманітарна асьветніцкімі мэтамі.

Вось што ў „Жалейцы“ гаворыць гарэлка свайму спажыўцу:

„На лоб павылазяць
Чырвоныя вочы,
І воблік твой сказяць,
Твар плямы абскочаць.
Расхрыстаеш грудзі
Ты, п‘яны гуляка,
Язык-жа твой будзе
Брахаць, як сабака.
О дзікім, о, страшным
Зраблю без прагляду.
Га! бойся, няшчасны,
Быць пад маёй уладай...

Ідэйны ўпадак, плач, беспрасьветнасьць, бязвер‘е, дэградацыя,—вось чым характарна творчасьць Купалы эпохі рэакцыі. Прычыну гэтаму тлумачыць сам поэт, калі „Дунулі сіверы“...

„Думалі душы—ўжо вольныя—
Дні ўсешчасьлівасьці блізка,
Ды знаць гаротным бяздольнае
Суджана з роду, з калыскі“.

За гэты-ж час Купала разгортвае і некаторыя свае філёзофскія прынцыпы. Вера ў рок, у фатальнасьць жыцьцёвых законаў („Адвечная песь-

ня"), вось па сутнасьці і ўся філёзофія Купалы гэтага часу.

Дэпрэсія творчасьці Купалы завяршаецца пэўнай філёзофскай сыстэматызацыяй, адпаведнай упадніцкаму ўманастрою поэта за гэты пэрыод.

„Гусьляром" не заканчваюцца ўпадніцкія настроі ў творчасьці Купалы, яны знаходзяць месца і ў „Шляхам жыцьця".

І ў „Шляхам жыцьця" Купала часьценька выбіваецца з сіл, успамінае магілку.

„З доляй змагацца з сіл выбіўся я,
Эх, ты, магілка, эх, дзе ты мая?

І нават у 1914 годзе Купала:

„Пытаньне злога не пазбыцца
Як мара бледная, стаіць:
Куды ісьці? за што ўчапіцца?
Якім багом паклоны біць?
. . . . . . . . . . . .
Служыць, служыць жадаў народу,
Сваім закованым братом...
І сіл ня стала з непагодай
Вясьці вайну, вясьці з жыцьцём.
. . . . . . . . . . . .
У жуткім, чорным беспрасьвецьці
Бушуе выпасьвены кат...
Любіць... Каго? за што любіць?
І ненавідзець сіл нязват.

І поэт зварочваецца да бога:

„Сашлі мне сьветлую падмогу
Астаткі сіл сваім аддаць
І не зрабіўшы брату злога—
Пад крыжам бацькавым сканаць“.

## V

З 1909—10 гг. пачынаецца новая хваля рэволюцыйнага руху, якая сваім подыхам уплывае на поэта, узбуджае яго настрой.

У 1910—11 гг. поэт у асноўным выбраўся з атмосфэры журбы і маладушнасьці, набраўся новых сіл, веры ў будучыню і пачаў зноў сьпяваць свае песьні, на гэты раз больш гучней, больш актыўна, мастацка больш высока. Але-ж і песьні набылі другі характар, разгарнулі і політычныя імкненьні і ідэалы Купалы. Купала ўздымае сваю творчасьць на вышыню політычных задач, і па сутнасьці ператвараецца ў песьняра нацыянальнага вызваленьня.

Ва ўмовах Беларусі, як краіны нацыянальна прыгнечанай, вызваленьне ад самадзяржаўя было-б адначасова і вырашэньнем нацыянальнага пытаньня ў той меры, у якой яно наогул магчыма ва ўмовах панаваньня капіталу з яго „дэмократыяй“. Нацыянальнае вызваленьне,

барацьба за яго, зьяўлялася непарыўнай часткай буржуазна-дэмократычнай рэволюцыі. Але розныя клясы па рознаму разумелі нацыянальнае вызваленьне і яго шляхі. Для беларускіх працоўных мас нацыянальнае вызваленьне было цесна зьвязана з соцыяльным вызваленьнем, у той час як для беларускай буржуазіі яно выражалася ўвесь час у патрабаваньні рэформы, уступак з боку самадзяржаўя.

Не падлягае сумненьню, што соцыяльнае асяродзьдзе, у якім разгортвалі сваю літаратурна-мастацкую творчасьць пісьменьнікі так званага „нашаніўскага" пэрыоду, г. зн. пэрыоду буржуазна-дэмократычнай рэволюцыі, прасякнута буржуазнай ідэолёгіяй. Буржуазная ідэолёгія ў розных яе адценьнях і варыянтах прасякала сабою творчасьць амаль кожнага беларускага пісьменьніка, які выходзіў у той час на літаратурную ніву нават з іншых соцыяльных слаёў.

Беларуская буржуазія ў пачатку дваццатага стагодзьдзя не зьяўлялася політычна-пануючай клясай, яна об'ектыўным ходам гісторыі ставілася ў пэўную супярэчнасьць з самадзяржаўем, якое тармазіла процэс яе формаваньня. Гэта асаблівасьць буржуазіі Беларусі—краіны нацыя-

нальна прыгнечанай,—надавала спэцыфічны характар і буржуазнаму руху на Беларусі. Калі расійская буржуазія пасьля рэволюцыі 1905 г. пайшла на адкрыты саюз з самадзяржаўем расійскага цара супроць рабочай клясы і рэволюцыйнага сялянства, то беларуская буржуазія, выстаўляючы нацыянальныя запатрабаваньні, прыкрываючы свае суб'ектыўна - клясавыя, эксплёататарскія інтарэсы агульна-нацыянальнымі лёзунгамі (бацькаўшчына, роднае слова, права на друк літаратуры на беларускай мове і г. д.), праяўляла яшчэ адносна прогрэсыўныя тэндэнцыі. Патрабаваньне роднай мовы, імкненьне беларускай буржуазіі да консолідацыі і аформленьня ў дзяржаўна-пануючую клясу ня прыходзіла яшчэ ў рэзкую супярэчнасьць з рэволюцыйным нацыянальна-вызваленчым рухам шырокіх народных мас Беларусі.

„Для украінцаў і беларусоў, напрыклад, толькі чалавек, які сваімі марамі жыве на Марсе, мог-бы адмаўляць, што тут няма завяршэньня нацыянальнага руху, што абуджэньне мас да авалоданьня роднай мовай і яе літаратурай (а гэта—неабходная ўмова і спадарожнік поўнага разьвіцьця капіталізму, поўнага пранікненьня абмену да апошняй сялянскай сям'і)

тут яшчэ адбываецца. „Бацькаўшчына“ тут яшчэ не прапяяла сваёй гістарычнай песьні. „Абарона“ „бацькаўшчыны“ яшчэ можа быць тут абаронай дэмократыі, роднае мовы, палітычнай свабоды супроць прыгнятаючых нацый, супроць сярэднявяковай, тады, як англічане, французы, немцы, італьянцы хлусяць цяпер, кажучы пра абарону сваёй бацькаўшчыны ў данай вайне, бо ня родную мову, не свабоду свайго нацыянальнага разьвіцьця абараняюць яны на справе, а свае рабаўласьніцкія правы, свае колёніі, „сфэры уплыву“ свайго фінансавага капіталу ў чужых краінах дъ інш.“ (Ленін, т. XIII, стар. 350).

Адносна прогрэсыўныя тэндэнцыі і роля буржуазнага руху на Беларусі ў часы буржуазна-дэмократычнай рэволюцыі зусім не выключае рэакцыйных у ім тэндэнцый, імкненьняў беларускай буржуазіі да зьдзелак з самадзяржаўем і рэакцыйнай расійскай буржуазіяй, практыкі яе ў гэтым напрамку. Трэба мець на ўвазе, як папярэджвала рэзолюцыя жніверьскай нарады ЦК Р. С. Д. Р. П. у 1913 г., што „памешчыкі, папы і буржуазія прыгнечаных нацый ня рэдка прыкрываюць нацыяналістычнымі лёзунгамі імкненьні раз'яднаць рабочых і адурачыць іх, утвараючы за іх сьпіною зьдзелкі

з памешчыкамі і буржуазіяй пануючай нацыі а ўшчэрб працоўным масам усіх нацый“.

Справа ў тым, што разгортваньне беларускага нацыянальнага руху прыпадае на такі час, калі на гістарычную арэну зьявілася новая, да канца пасьлядоўная, рэвалюцыйная кляса, варожая ўсякім відам і формам эксплёатацыі і клясавага прыгнёту,—гэта рэвалюцыйны пролетарыят. Той факт, што рэвалюцыйны пролетарыят—антыпод буржуазіі, у рэвалюцыі 1905 г. выступіў як самастойная рэвалюцыйная сіла і як кіраўнік дэмократычных элемэнтаў (сялянства і гарадзкой дробнай буржуазіі) са сваімі уласнымі мэтодамі барацьбы (усеагульная стачка), рашучасьць і пасьлядоўнасьць, няпрымірлівасьць яе,—узбуджала даволі сур'ёзныя клопаты буржуазіі. Зусім зразумела, што беларуская буржуазія, памешчыкі з папамі ў іх барацьбе супроць рабочае клясы, супроць рэвалюцыйнага сялянства шукалі падтрымкі і саюзьнікаў у асобе самаўладзтва і расійскай буржуазіі.

Разьвіваючыся як поэт, Купала ад пасыўна сузіральных адносін да абкружаючага жыцьця, ад фіксацыі зьяў соцыяльнай несправядлівасьці ад аплакваньня нядолі беднага беларуса пераходзіць да актыўна-дзейнай творчасьці, з пэў-

нымі мэтаімкненьнямі. Ён адчувае „гулкі стогн лесу“, чуе як „з ветрамі, з бурамі б‘юць на трывогу“.

Купала чутка прыслухоўваецца да „Нёмана“ „Сьвіслачы“, вёскі, якая „пакуль-што маўчыць“.

Яго верш „Заваяваным“ дыхае вялізарнай сілай, прызывам працягнуць справу тых, хто „ў дамоўку бяз часу вышлі“.

„Сьпіце ўсе тыя, што праўду на сьвеце шукалі,
І, не здабыўшы, у дамоўку бяз часу вышлі.
Гразьзю ў вас кідалі, вольна дыхаць не давалі..,
Хай-жа пацешацца: ўжо вы спачылі ў зямлі.
. . . . . . . . . . . . . . . .
Сьпіце вы, слаўныя гора і працы патомкі,
Хутка над вамі распалім памінкаў агонь!
. . . . . . . . . . . . . . . .
Сьпіце! Мы вашых на век не забудзем магілаў;
Збуджаны вамі, мы ўскрэсьлі, мы больш не заснём“.

У песьнях Купалы ўжо менш засмучанасьці, менш беспрасьветнасьці, нават тады, калі ён апявае „жыцьцё наша праклятае“. Адначасова з гэтым, мяняецца і характар песьні, надаецца ім і другі павышаны рытм, зьмяняюцца пэрсонажы.

„Зазьвіні ты, як звон, і удар, як пярун,
Песьня наша, як воля магучая!
Хай крыўдзіцель дрыжыць, як падбіты каршун,
Хай нясуцца ў сьвет рэхі грымучыя.
. . . . . . . . . . . . . . . .

Пей-жа, песьня, дзень, ноч, песьня родная нам,
Апявай жыцьцё наша праклятае,
І зайграй ты па сэрцу хоць раз бедакам,
Наўчы, як знайсьці шчасьце багатае".

Купала заклікае да сьмеласьці ісьці наперад і весьці другіх, і тады „будзе твой верх, твае права ўсягды". У 1912 г. Купала піша баявы верш „Годзе"...

„Годзе брахні ўжо, падкупленых зводаў!
Годзе таптаньня прадвечных сьвятых!
Сьцежку свабоднаму духу народу,
Сьцежку да сонца і зор залатых".

Купала заклікае беларуса аратага сьмялей узьняць вочы к сонцу.

„Сьмялей, беларус араты!
Сьмялей уздымай к сонцу вочы,—

а ў другім вершы кліча родную старонку паказацца сьвету:

„Пакажыся сьвету,
Сьвету ды народу
Родная старонка,
Як зара да ўсходу".

Прарок Купалы, які „хадзіў паміж людзей, сярод народу таго краю, што на'т свайго імені ня знаў", таксама заклікае рабскія

натуры паўстаць, узяць у рукі паходні, скідаць ёрмы.

„Паўстаньце, рабскія натуры,
Пакіньце свой адвечны сон,
Загаманіце віхрам, бурай,
Каб ажна дрогнуў ваш палон!

. . . . . . . . . . . . . .

Пара ў рукі браць паходні,
Ўставаць, ісьці, ноч расьсьвятляць!
Бо што ня возьмеце сягоньня,
Таго і заўтра вам ня ўзяць.
На зло крывавым перашкодам
Скідайце ёрмы, клічце сход
І дайце знаць другім народам,
Які вы сільны йшчэ народ".

І ня гледзячы на тое, што

„... людзі, глянуўшы на сонца,
Адказ казалі грамадой:
Паколькі-ж нам дасі чырвонцаў,
Калі мы пойдзем за табой?"

Купала не перастае пець прызыўныя песьні, якія заклікаюць беларускі народ змагацца за сваю будучнасьць, нават малюючы жахлівы вобраз разбураючай дзейнасьці капіталізму ў сваёй драме патрыархальнай Беларусі, „Раскіданае гняздо".

Драма прасякнута глыбокім соцыяльным протэстам як супроць памешчыцкай эксплёатацыі,

так і супроць капіталізму, які, пранікаючы ў земляробства, захопліваючы яго ў сваю арбіту, разарае сялянскія масы, руйнуе дробную гаспадарку. Гэты глыбокі протэст накіраван супроць тых соцыяльных умоў, якія асуджаюць мільённыя масы на жабрацтва, на галодную сьмерць, на пакуты. Але і тут Купала ня бачыць, не асьведамляе клясавай сутнасьці гэтага процэсу, ня можа знайсьці выйсьця з яго, ня можа сваёй творчасьцю орыентаваць і заклікаць працоўныя масы на сапраўдную рэволюцыйную барацьбу з тымі ўмовамі, у якія ставіць капіталістычна-памешчыцкі лад шырокія сялянскія бядняцка-серадняцкія масы. Нацыянал-лібэралізм, які ў гэты час інтэнсыўна ўплывае на Купалу, орыентуе яго ў другі бок ад сапраўды рэволюцыйнага шляху. Адлюстроўваючы об'ектыўна рэальны процэс разарэньня капіталізмам дробнасялянскіх, напоўпатрыярхальных гаспадарак, Купала ўзводзіць гэты процэс на ступені „нацыянальнага разарэньня“.

Роднае слова беларускае, якое так беражліва шануе поэт, якое так узбагаціў сваёю творчасьцю, робіцца з цягам часу штандарам барацьбы з тымі ўмовамі, што крыўдзілі яго, што не давалі беларусу сваім родным словам выла-

жыць сваю скаргу, прызываць братоў на барацьбу. Купала піша, што калі:

„З попелу мінуўшых дзён сьляпых, крывавых
Весела ўзойдзе рунь сьвятлянай славы,
І радзімым словам, рукой мазолістай
Беларус упіша на старонцы чыстай
Кнігі ўсіх народаў важна, ў няпрымусе
Сумную аповесьць роднай Беларусі“.

Куды-ж клікаў Купала народ свой, за якую лепшую будучыню? Купала, узьняўшыся вышэй унутранага протэсту супроць соцыяльнага прыгнечаньня, аднак не ўяўляў сабе ясна мэты вызваленчага руху. Яна ў яго ня ясная, расплыўчатая, да простага абмежаваная.

Ён часта зварочваецца да сонца і заклікае яго:

„Гэй ты, сонца, гары
Ад зары да зары,
Ланцугі распалі
Па ўсей чыста зямлі!“

Гэта сонца, як сымбаль свабоды, як сымбаль лепшай будучыні Купала часта кліча:

„Дык глянь з харомаў вольных, высокіх
Да Крывіцкіх туманных нізін...
Казкай векаў блізкіх і далёкіх
Клічам, сонца, цябе як адзін!

Протэст Купалы галоўным чынам накіраван супроць фэўдальнай эксплёатацыі, супроць царскага палітычнага прыгнечаньня роднай старонкі, мэты яго, імкненьні ня выходзяць з буржуазна-дэмократычных рамак. Будучнасьць Беларусі марылася поэту як дэмократычная дзяржаўнасьць беларускага народу, які, па думцы поэта, адрозьніваецца ад іншых народаў, а Беларускі край ад іншых краёў тым, што:

„сьвет там выдумкі знае—
троны, кар ны, вісельні, кулі,—
выдумаць гэта мы ў сваім краі
неяк мінулі“.

Ідэалы Купалы ня выходзілі з рамак буржуазна-дэмократычнай дзяржаўнасьці ў нацыянальнай афарбоўцы.

Яму хацелася, каб Беларусь была „Вольнай“, як і ўсе іншыя народы.

„Глянь, во англік ці немец!—яны ўсе ўмеюць скеміць
Ім і шчасьці і радасьць пакорны:
Мы ляжым як мядзьвёдкі, як гнілыя калодкі,
І нас топча хто болей праворны“.

Каб яна заняла „свой пачэсны пасад між народамі“. Сваім „сваякам па гутарцы“ Купала ня двухсэнсова кажа:

„Дык хай-жа В с не асіле зьверства непагоды,
Распусьціце свае крыльля, як і ўсе народы“.

Таму што

„Простым мы словам з сьветам гаворым,
Песьні аб цяжкай творым нягодзе,
З думкамі рвёмся к сонцу і зорам,
рвёмся к свабодзе."

І далей

„хочам па просту, каб лепш ручыла
Нашым хацінам, нашым прыплодам,
Каб стаць раўнаю славай і сілай
Іншым народам".

Вынікам усяго гэтага, па думцы поэта, павінна быць вольнасьць „пачэсны пасад між народамі", „сваё родненькае слова" і нарэшце і якасьці гаспадарчага выніку:

„О, тады сноп у сноп
Жніва наша будзе...
Сотня коп, мільёнаў коп...
Дзівуйцеся людзі!"

Якімі-ж сродкамі дасягнуць усяго гэтага? Якімі шляхамі ісьці да сонца, да зор, да свабоды?

Купала дае на гэта такі адказ, зварочваючыся да моладзі:

„Схамянайся-ж ты, моладзь арліна!
У бок другі віхры веяць прымусь.
Бяры сьветыч, ідзі за судзьбінай,
Ідзі з словам сьвятым Беларусь!"

Такім чынам, калі прыняць дамініруючыя настроі вершаў, то мы можам зрабіць вынік, што шляхам, якім Купала мысьліў, што пойдзе Беларусь да сваёй будучыні, то гэта барацьба, рашучая, крывавая барацьба ўзьняўшыхся народных нізін. І ён кідае агністы заклік да сакалінай сям'і маладой Беларусі.

„Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі,
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі".

Купала піша агністыя, заклікаючыя з вялізарнай сілай—вершы да народных „нізін", якіх заклікае паўстаць, ісьці на барацьбу за сваю бацькаўшчыну. Будучыню Беларусі ён зьвязвае з барацьбой народных нізін, на гэтыя нізіны ён орыентуецца, верыць у іх сілу і перамогу. Вось гэта робіць Купалу сапраўдным гусьляром рэволюцыйна-дэмократычнага, нацыянальна-вызваленчага руху, робіць яго сапраўдным народным поэтам, што на многа галоў вышэй узнымае яго ад нашаніўскіх лібэралаў.

Але-ж гэты шлях не адзіны. У Купалы ёсьць і другі шлях, якім ён марыў дасягнуць лепшай долі, шчасьця і багацьця. Гэта той шлях, элементы якога мы ўжо знайшлі ў „Жалейцы",

у вершы „каб я цёмны ня быў, чытаць кніжкі ўмеў, я-б і долю здабыў, я-б і песеньку сьпеў“.

Гэты асьветніцкі шлях дасягненьня лепшай долі зноў раіцца Купалай беларусу, як роўназначны, а потым адзіны, а не як падпарадкаваны, для дасягненьня „долі і волі“. Варта саслацца хоць бы на верш са „Шляхам жыцьця“, „Вучыся“.

Элемэнты, што былі ўжо ў пачатку творчасьці, зараз разгарнуліся ў сыстэму, занялі домінуючае месца. Уплыў нашаніўскай ідэолёгіі на поэта дасягнуў такое ступені, калі поэт сам ператварыўся ў ідэолёга, баяна нашаніўства. Купала робіцца цалкам сформаваным нашаніўцам з усімі ўласьцівымі нашаніўцу якасьцямі. Нацыянальна-вясковая абмежаванасьць, ідэалізацыя патрыярхальна-фэўдальнай мінуўшчыны, Беларуска-Літоўскай Русі, абарона „самабытнасьці“ беларускага народу, а адсюль затушоўваньне клясаў і клясавай барацьбы ў беларускім народзе, скажонае мастацкае адлюстраваньне беларускай рэчаіснасьці „маці бацькаўшчына“, „сьвятая Беларусь“.

Каб пацьвердзіць гэтае, спашлемся на творы поэта. Нацыянальная вясковая абмежаванасьць

поэта найбольш ярка праявілася ў вершу „Ня шукай“ (спадчына):

„Ня шукай сабе дружкаў
Між чужынцаў, між піяўкаў,
Ні ў месьце, ні ў палацы,
Ні пры лёгкай панскай працы,—
Ня шукай ты там дружакаў!“

Тут Купала бярэ ў адзін радок і чужынца і піяўкаў, і месца і палац, гэта значыць, што і рабочы гораду і селянін іншай нацыі ня можа быць дружаком нацыянальнага рэволюцыянэра.

Дзе-ж Купала раіць у працівалегласьць гэтаму шукаць дружакоў?

„Ты іх знойдзеш вельмі блізка
Каля хаты, каля нізкай,
Дзе ганяў жывёлу змалку,
Дзе касой махаў на ранку,
Толькі ўмей шукаці блізка!“

Зразумела, што такая вясковая, патрыярхальна нацыянальная абмежаванасьць ні ў якім разе ня можа быць уложана ў рэволюцыйны багаж поэта.

Такая-ж абмежаванасьць знаходзіць месца ў прызыўна-баявым вершы „Годзе“:

„Годзе заходняй ці ўсходняй культуры!
Для беларуса цана ім адна,
Ўсе вы, панове, аднакай натуры:
З сэрца чужога кроў ссалі-б да дна“.

Купала не зразумеў таго, што і ў заходняй і ў усходняй культуры, і ў культуры яго народу ёсьць дзьве культуры, не зразумеў ён і таго, што калі „Усе панове“ „аднакавай натуры“, то рабочыя з „панове“ не аднакавы, а самі рабочыя паміж сабою прынцыпова не адрозьніваюцца па сваім натурам.

Ідэалізацыя мінуўшчыны, на якую мы зьвярталі ўвагу яшчэ пры разглядзе „Жалейкі“, дасягае тут свайго вышэйшага пункту, свайго завяршэньня. Фэўдальна-эксплёататарскае старое часоў „Русі і Літвы“ часоў „Войскаў Усяслава“ апяваецца як нешта героічнае, як нешта народнае, што мае агульна-народнае, агульна-нацыянальнае значэньне.

„Перашло, мінула,
Што калісь жыло,
Ў курганох заснула
Зельлем зарасло.
Пад магіл навалай
Дрэмле Русь, Літва—
За тэй тая з хваляй
Легла галава.
Ня гудзе ў пававе
Голас вечавы,
Ня шукаць князя
Славы і бітвы.

Войска Усяслава
Ня ідзі ў паход
На той бок крывавы
За свой край, народ.
Сьцены і запоры
Палачан, Мянчан
Леглі ў разоры
Зможаных палян.
Ні сьвятых дуброваў,
Зьніч пайшоў з вадой,
Загасьціў лад новы,
Ды ня той, ня свой.
Слых адно праходзе
Калі-ні-калі
У жывым народзе,
На жывой зямлі".

Гэтая слашчава романтычная ідэалізацыя „Залатога веку" патрыярхальна-фэўдальнай Беларусі ня можа таксама быць аднесена да рэволюцыйнай спадчыны Купалы.

Самабытнасьць беларускага народу, у тым, што ён адзіны, цэльны, вясковы народ, у ім няма клясаў, няма багатых, а парабашчоны чужынцамі ўвесь беларускі народ са сваёй „Бацькаўшчынай маці", якая знаходзіцца ў душы кожнага беларуса.

Творчасьць Купалы з актыўна-дзейнай рэволюцыйнай ператвараецца напярэдадні Кастрыч-

ніка ў лібэралісцкую, набывае глыбока-нацыяналістычны характар, з усімі ўласьцівымі нашаніўскаму нацыяналізму рысамі.

## VI

На рэволюцыю Купала адгукнуўся не адразу, галасы яго жалейкі кінулі граць, гучэць.

Толькі, пасьля, ужо з другой паловы 1918 г., Купала ня сьмела бярэ і прабуе галасы жалейкі, але-ж яго ахапляе трывога.

„Я зноў заснуўшую было жалейку
Бяру і пробую ў ёй галасоў:
Ці хопіць сьветлых, звонкіх думак—слоў,
Ці гладка пойдзе песьня-добрадзейка?
І пачынаю йграць з трывогай нейкай,
Хоць песьня як і здаўных б'е часоў,—
Зьвініць, як вецер паміж верасоў,
І ў перагонкі рвецца з салавейкай.
А ўсё-ж, як тамка сваякі--суседзі
Як паймуць, хацелася-бы знаць,—
Ці блаславяць, ці ўтопчуць гідка ў гаць?
Адно снуючы з сумам па прасьледзьдзі,
Я голасна йграць буду ў тайным брэдзе.
Для бацькаўшчыны-маці буду йграць!"

Чаму-ж гэта такая трывога ахапіла поэта, чаму гэта ён зьбіраецца „у тайным брэдзе“ іграць пра бацькаўшчыну? Няўжо-ж справа толькі ў суседзях? Не, справа ня ў суседзях. Справа ў тым, што Кастрычніцкую рэволюцыю Купала сустракае з позыцыі буржуазнага нацыянал-лібэралізму, у лягеры нацыяналізму.

Соцыялістычны характар Кастрычніцкай рэволюцыі, вынік яе—пролетарская дыктатура не ўкладаліся ў рамкі буржуазнай, нацыянал-лібэралісцкай ідэолёгіі, карэнным чынам супярэчылі ёй, адмаўлялі яе. Той, хто аставаўся па позыцыях буржуазнай ідэолёгіі, той няўхільна павінен быў прысьці ў супярэчнасьць з рэволюцыяй, супроцьпаставіцца ёй, весьці супроць яе барацьбу, як гэтага вымагалі клясавыя інтарэсы буржуазіі, ня гледзячы на суб'ектыўныя сымпатыі ці антыпатыі да буржуазіі таго, хто знаходзіўся ў палоне гэтай буржуазнай ідэолёгіі.

Так здарылася з Купалам. Ён ня ўспрыняў пролетарскую рэволюцыю, як рэволюцыю, толькі якая можа вызваліць працоўныя масы ад эксплёатацыі капіталістаў, памешчыкаў і ад нацыянальнага прыгнёту. Пролетарская дыктатура ў

яго вачох зьяўлялася, як новая форма соцыяльнага і нацыянальнага прыгнёту.

„Здавалася ноч не пяройдзе,
Іржа ня згрызе вечных путаў,—
Ах бліснуў пажар на Усходзе,
І дрогнулі рабскія скруты
І дрогнула Крыўды ўсяўлада
Разьлёгся скрозь кліч пяруновы;
Апалі кароны, пасады,
З нявольнікаў спалі аковы.
І мілай пацехай зазьзяла
І доля і слава людзкая;
Дый толькі знаць слава і хвала
Ня доўгавечнай бывае.
Раскованы раб сябе выдаў—
Ня ўзьнёсься ў высь дух чалавечы
Нявольнік пабратаўся з крыўдай
І ў помач ёй даў свае плечы.

Інакш кажучы, Купала астаўся яшчэ ў палоне нашаніўскай ідэолёгіі.

Пасьля трывожнай спробы, Купала зноў засьпяваў бацькаўшчыне, пачаў зноў заклікаць народ свой на барацьбу супроць тых, хто „тваю маці—бацькаўшчыну рэжа жывую, рве на часьці, на кускі“, супроць „ворагаў беларушчыны“. Але-ж Купала не заўважыў таго, што беларускія працоўныя масы ў той час вялі барацьбу як супроць ворагаў беларушчыны;

так і супроць ворагаў з самой беларушчыны, якія імкнуліся з сярэдзіны разарваць цела Беларусі, патапіць у крыві, крывёю заваяваны Кастрычнік.

Купала не зразумеў соцыялістычнага характару нашай рэволюцыі, ня здолеў захапіцца баявым і творчым энтузіязмам працоўных, што стварылі прадпасылкі соцыялістычнага будаўніцтва, што разьбівалі кайданы адвечнага соцыяльнага рабства, што стварылі новае, але не патрыярхальнае, капіталізмам „раскіданае гняздо“, а фундамант пад сусьветную комуністычную рэволюцыю.

„Дробны буржуа... трымаецца ілюзіі наконт таго, быццам-бы дэмократычная рэспубліка азначае „чыстую дэмократыю“, „свабодную народную дзяржаву“, пазаклясавае ці надклясавае народаўладзтва, чыстае праяўленьне ўсенароднай волі і т. д. і да т. п. Трываласьць гэтых прадрассудкаў дробна-буржуазнага дэмократа няўхільна выклікаецца тым, што ён далей стаіць ад вострай клясавай барацьбы, ад біржы, ад „сапраўднай“ політыкі“. (Ленін).

Пераходзячы да эпохі мірнага соцыялістычнага буданіцтва, да эпохі нэпу, трэба мець на ўвазе, што разьвіцьцё беларускай літаратуры

ўздымаецца на новую, якасна іншую, вышэйшую ступень.

Асноўным фактам, характарызуючым літаратурную гісторыю гэтага часу, ёсьць факт зьяўленьня новай, народжанай Кастрычнікам літаратуры, якая да гэтага часу праявіла сябе ня толькі як вынік клясавай барацьбы, але як фактар у гэтай барацьбе. У гэты час мы маем ужо і першыя парасткі пролетарскай літаратуры. Праўда, гэта новая літаратура не пазбаўлена ўплыву літаратурнай спадчыны „нашаніўцаў“, але яна ня толькі сама знаходзілася пад пэўным уплывам—яна ў сваю чаргу ўплывала на гэтую спадчыну.

Вывучаючы гісторыю беларускай літаратуры ігнараваць гэты факт было-б недалушчальнай памылкай. Аднак, у нашу задачу цяпер не ўваходзіць дасьледваньне літаратуры, народжанай Кастрычнікам.

У часе Кастрычніка і грамадзянскай вайны Купала заняў месца на барыкадах клясавае барацьбы з боку ворага.

Пераможнае сканчэньне грамадзянскай вайны, пераход да нэпу абумоўлівае далейшую эволюцыю Купалы, як Коласа, Бядулі, Гартнага і інш. пісьменьнікаў—„нашаніўцаў“.

Буржуазная і частка дробнабуржуазнай нацыяналістычнай беларускай інтэлігенцыі, як і капіталістычныя элемэнты, успрынялі нэп, як „спуск на тармазох“ пролетарскай дыктатуры. Дапушчэньне прыватных капіталістычных элемэнтаў у вызначаных рамках нэпу было вытлумачана, як зварот да капіталізму на ачышчанай Кастрычнікам ад памешчыкаў і нацыянальнага прыгнёту самадзяржаўя беларускай глебе. Рэалізацыя заваёў Кастрычніка, стварэньне беларускай пролетарскай дзяржаўнасьці, форсаваны рост гаспадаркі і культуры ўспрыймаліся нацыяналістычнай інтэлігенцыяй, як „адраджэньне“, пад якім разумелася ўстанаўленьне буржуазных адносін.

Адсюль „прызнаньне“ Кастрычніка, „прымірэньне“ з бальшавізмам, стаўка на тое, каб практычнай дзейнасьцю накіраваць разьвіцьцё БССР па капіталістычным шляху.

Некаторы, няўхільны да часу, рост капіталістычных элемэнтаў ва ўмовах нэпу, актывізацыя гэтых элемэнтаў надаюць жыватворчыя сокі для творчасьці некаторай часткі старых пісьменьнікаў, нараджаюць сваіх маладых мастацкіх выразьнікаў з дробна буржуазнага асяродзьдзя (Дубоўка, Пушча, Зарэцкі ды інш.),

Янка Купала, як мы ўжо гаварылі, сустрэў Кастрычнік як ідэолёг буржуазнага нацыяналадраджанізму. Гэтым у асноўным і тлумачыцца варожая яго позыцыя да пролетарскай рэволюцыі і дыктатуры пролетарыяту ў часы грамадзянскай вайны.

У першыя гады мірнага будаўніцтва Купала, асьлеплены буржуазным нацыяналізмам, усё яшчэ актыўна супроцьстаўляецца ў сваёй творчасьці пролетарскай дыктатуры. Найбольш характарным і буйным творам для гэтага часу зьяўляецца яго п'еса „Тутэйшыя" (1922 г.), а таксама вершаваны твор „Перад будучыняй".

На ідэолёгіі, якая знайшла сваё выяўленьне ў п'есе „Тутэйшыя", трэба спыніцца, бо яна характарызуе ня толькі Янку Купалу таго часу.

Асноўнымі пэрсонажамі, якія выяўляюць думкі і настроі аўтара, зьяўляюцца Янка Здольнік—настаўнік і Аленка—вясковая дзяўчына, вучань Янкі Здольніка.

Янка Здольнік зьяўляецца тыповым вобразам вясковага абмежаванага нацыяналіста, інтэлігента, якому аўтар п'есы надаў ролю правадыра нацыянальна-вызваленчага руху.

Янка Здольнік органічна ня любіць горад, ідэалізуе вёску з усімі яе атрыбутамі. „Там на

весцы, патрэбней, чымся тут, а да таго—ня люблю я гораду: вельмі ўжо ў ім цяжкае паветра",—кажа Янка Здольнік.

Тое-ж кажа і Аленка: „Як вам, цётачка, будзе надта маркотна, прыяжджайце да нас на вёску, там сонца весялей сьвеціць і людзі там лепшыя".

Янка Здольнік і іншыя пэрсонажы, як нацыяналістычная беларуская інтэлігенцыя, ня бачаць ў горадзе пролетарыяту, які вядзе барацьбу супроць усякага прыгнёту, яны заўважаюць толькі гандляра, чыноўніка, вялікадзяржаўнага дзяржыморду, ды мяшчан з Камароўкі і Пярэспы, якія рабуюць склады і т. д.

Янка Здольнік і Аленка паводле твору зьяўляюцца носьбітамі „беларускага духу", „беларускай самабытнасьці", носьбітамі „ідэй вызваленьня". Гэтым вобразам супроцьстаўляюць вобразы Мікіты, калескага рэгістратара, вялікадзяржаўнага расійскага дзяржыморды і вобразы двох вучоных—усходні і заходні. З вачэй аўтара зьнік расійскі рэволюцыйны пролетарыят, рэволюцыйнае сялянства, а таксама зьніклі і польскія працоўныя масы. Вялікадзяржаўны дзяржымордa Мікіта для аўтара зьяўляецца сымболем усяго расійскага.

Барацьбу рабочых і сялян Беларусі, разам з рабочымі і сялянамі Расіі, Украіны і т. д. супроць контррэволюцыі—у тым ліку і супроць беларускай—аўтар паказвае, як працягваньне вялікадзяржаўнай політыкі. Разгон контррэволюцыйнага беларускага конгрэсу ў 1917 г. разглядаецца як барацьба супроць вызваленьня. Устанаўленьне пролетарскай дыктатуры на Беларусі разглядаецца, як нешта навязанае беларускаму народу. „Якімі-б раскошамі матэрыяльнымі нас не надзялілі, ніколі яшчэ ня будзем шчасьлівы, пакуль чужая воля будзе гаспадаром над нашай воляй. Каб гэтага ня было мы павінны растаптаць, зьніштожыць доўгавечную ману, якая вучыць, што мы ня ёсьць мы, што мы нейкае нешта, якое абы накарміў як быдлё, дык і сыта будзе. Мы павінны душу нашу выявіць у сваім „я", у сваёй самабытнасьці і сьмела сягнуць па сваё неадменнае права самім распараджацца гэтым сваім „я".

Так дэкляруе Янка Здольнік свае зыходныя позыцыі для барацьбы за „беларускае" „я".

Беларуская душа, беларускае „я" бярэцца тут не як клясавае „я", а як агульнае—беларускае. Янка Купала ня хоча прызнаць таго, што ўнутры беларускай нацыі існуюць клясы,

ня бачыць, як яны змагаюцца паміж сабою. Ён хоча быць надклясавым, агульна-народным, і весьці барацьбу ня супроць клясаў, а супроць расійцаў, палякаў, зноў-жа ўзятых без падзелу на клясы.

„Калісь амэрыканцы, змагаючыся з Англіяй за сваю незалежнасьць, напісалі на сваім сьцягу цяўміручыя словы: „Амэрыка для амэрыканцаў. І гэта памагло: сягоньня Амэрыка вольная. Павінны пайсьці і мы па яе сьлядох і напісаць агністымі рукамі на сваім сьцягу: „Беларусь...“

Так вызначае лёзунгі змаганьня Янка Здольнік.

Гэтая выпіска ёсьць концэнтраванае выяўленьне беларускага буржуазнага нацыяналізму. У гэтай выпісцы выяўляецца буржуазны характар ідэолёгіі аўтара яе, ня толькі ў тым, што бярэцца Беларусь як адзіная, таксама як і ў папярэдняй выпісцы, а і ў тым, што шлях буржуазнай, капіталістычнай Амэрыкі дэкляруецца ўзорным для разьвіцьця Беларусі, але і ў тым, што ва ўмовах пролетарскай дыктатуры гэтыя лёзунгі зьяўляюцца контррэволюцыйнымі, бо яны заклікаюць на разрыў адзінага фронту працоўных усіх нацый супроць капіталістаў і памешчыкаў таксама ўсіх нацый.

Такія лёзунгі цягнуць назад, да буржуазнага ладу, які на $^1/_6$ земнае кулі ўжо зьнішчан і заменен вышэйшай формай грамадзкіх адносін пабудаваных не на эксплёатацыі аднэй клясы другой, не на прыгнечаньні аднэй нацыі другой, а на аснове зьніщчэньня эксплёатацыі прыгнёту, на аснове братняга сужыцьця, саюзу працоўных, якія будуюць соцыялізм.

Мы тут ня будзем спыняцца на мастацкай форме гэтай п'есы. Формальныя компанэнты гэтага твору адпавядаюць стылю гротэску. Сама форма гэтага твору, асабліва сьць яе, давядзеньне адмоўных пэрсонажаў да гіпэрболы, асабліва падкрэсьліваньне антагонізму ў процэсе разгортваньня дзей,—усё гэта выклікана пэўнай, ясна акрэсьленай функцыянальнай установкай аўтара ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы.

„Тутэйшыя", „Перад будучыняй" і іншыя творы Купалы – гэта нацыяналістычная рэакцыя на пролетарскую дыктатуру ва ўмовах пераходу да мірнага будаўніцтва, калі надзеі буржуазных і дробнабуржуазных нацыяналістычных элемэнтаў на рэстаўрацыю БНР узброеным шляхам былі апракінуты фактам перамогі рабочае клясы.

З такой-жа павышанай нацыяналістычнай рэфлекцыяй сустракае ўстанаўленьне і замацаваньне пролетарскай дыктатуры на Беларусі і Якуб Колас. У сваім „Водгульлі“, апяваючы „Родныя малюнкі“, Якуб Колас перамогу рабочае клясы і ўстанаўленьне пролетарскай дыктатуры на Беларусі ўспрыймае, як зьмену аднаго прыгнятальніка другім, як працягваньне старой песьні.

„Кавалі другія,
А ланцуг той самы—
Песьні ўсё старыя
Неаджытай гамы“.

Янка Купала праз героя сваёй драмы „Тутэйшыя“—Янку Здольніка—зварачаецца да беларусоў наогул, незалежна ад іх клясавае прыналежнасьці, з заклікам: „Будзем самі сабе гаспадарамі“, бо „пакуль ня зробімся самі сабе гаспадарамі, датуль ніякага ладу ні складу ў нас ня будзе“, а Якуб Колас у сваім гімне „Беларускаму люду“ заклікае гэты люд (агулам таксама бяз клясавай дыфэрэнцыяцыі) паўстаць супроць „чужаніц“,—гнаць іх „з нашай роднай зямлі“.

Вымушаны гістарычнымі абставінамі рыскі мір, згодна якому частка Беларусі асталася

над окупацыяй буржуазнай Польшчы, Якуб Колас успрымае, як дзялежку беларускай зямлі паміж чужаніцамі, „цёмных дарог махлярамі“,

„Нас падзялілі—хто? чужаніцы,
Цёмных дарог махляры.
К чорту іх межы! К д'яблу граніцы!
Нашы тут гоні, бары!“

А пасьля гэтага дэкляруецца:

„Будзем мы самы гаспадарамі,
Будзем свой скарб ратаваць!“

Характарна, што Якуб Колас, як і Янка Купала, не прызнаюць таго, што рабочыя і сяляне часткі Беларусі сталі ўжо самі гаспадарамі, заваявалі сваёй крывёю права на панаваньне, на будаўніцтва сваёй гаспадаркі і культуры.

Такім чынам, і Янка Купала і Якуб Колас у першыя гады пасьля сканчэньня грамадзянскай вайны яшчэ ня ўспрыймаюць перамогу рабочых і сялян над сваімі ворагамі, ня мірацца з фактам існаваньня пролетарскай дыктатуры, дзе рабочыя і сяляне Беларусі зьяўляюцца „самі сабе гаспадарамі“, а застаюцца яшчэ на буржуазна-нацыяналістычных позыцыях.

Адстанаўленчы пэрыод характарызуецца ростам соцыялістычнай гаспадаркі, стварэньнем

матэрыяльна-гаспадарчых умоў для далучэньня шырокіх працоўных мас Беларусі да культурнага будаўніцтва, аўладаньнем працоўнымі масамі культурнай спадчынай, а на гэтай аснове — ростам культуры пролетарскай зьместам і нацыянальнай формай. Але побач з гэтым адстаўленчы пэрыод характарызуецца пэўным ростам і ўмацаваньнем капіталістычных элемэнтаў у нашай краіне, ажыўленьнем дробнабуржуазнай стыхіі.

Капіталістычныя элемэнты песьцілі надзеі на перараджэньне пролетарскай дыктатуры, на растварэньне яе пад хімічным уплывам капіталістычных элемэнтаў. Клясавая барацьба, абвастрэньне якой адбывалася проста пропорцыянальна росту і ўмацаваньню соцыялістычнага сэктару, набывае новыя, больш складаныя формы.

Буржуазна-нацыяналістычныя элемэнты пад сьцягам „лёяльнасьці“ прыстасоўваюцца да ўмоў пролетарскай дыктатуры, з мэтай накіраваць процэсы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва па шляху „адраджэньня“, г. зн. па шляху перамогі капіталістычных элемэтаў над соцыялістычнымі.

Прыстасоўваньне гэтых бужуазна-нацыяналістычных элемэнтаў да ўмоў пролетарскай дык-

татуры „прымірэньне“ з бальшавізмам набывае часамі надзвычайна тонкія і складаныя формы.

Аднак, ня гледзячы на розныя формы і мімікрыю буржуазна-нацыяналістычнай ідэолёгіі, сутнасьць яе ясна. Яна зьяўлялася і зьяўляецца ідэолёгіяй капіталістычнай рэстаўрацыі, пад сьцягам „адраджэньня“. Буржуазна-нацыяналістычныя элементы ня толькі імкнуліся накіраваць гаспадарчае і культурнае будаўніцтва БССР па капіталістычным шляху, але разам з тым і для тых-жа мэт імкнуліся ўвесь процэс рэалізацыі працоўнымі масамі Кастрычніцкіх заваёў аблямаваць сваёй буржуазна-нацыяналістычнай, адраджэнцкай мішурой.

Кастрычніцкая рэволюцыя імі ўспрыймалася не як выходны пункт для гаспадарчага і культурнага будаўніцтва БССР, а як момант, які склаў пэрыод адраджэньня беларускага народу, які „пачаўся з пачатку XIX стагодзьдзя“.

Згодна вучэньню нацыянал-дэмократызму пролетарская рэволюцыя не вынікала з об‘ектыўнага ходу гісторыі Беларусі, а была занесена на Беларусь „маскоўскімі наезьнікамі“ („Звон“), „комісарамі заходняй вобласьці“ („Вольная Беларусь“). Пролетарская рэволюцыя на Беларусі ня ёсьць няўхільна вынікаючы рэ-

зультат унутраных законаў гісторыі Беларусі, а нешта чужароднае, зьнешняе, выпадковае. Таму яна ня спыніла працэсу „адраджэньня“.

„Рэволюцыя,—піша адзін з нацыянал-дэмократаў,—якая фактычна зьяўлялася руйнаваньнем, прыпыніла на некаторы час будаваньне адраджэньня, хоць, об'ектыўна, руйнуючы старое, давала яму непараўнальна вялікі штуршок“. А крыху раней той-жа нац-дэм. піша, што „ўмовы самога адражэньня кардынальна зьмяніліся ў пасьлякастрычніцкую пару і значна спрыяюць яго паскоранаму заканчэньню“. А таму, „не зважаючы на тое“, што адбылася пролетарская рэволюцыя, працэс адраджэньня ня спыніўся, ён працягваецца і ў нашы дні“.

Такім чынам, буржуазна - нацыяналістычная інтэлігенцыя ўспрыймае Кастрычніцкую рэволюцыю толькі ў той меры, у той частцы, дзе яна разьбіла ланцугі нацыянальнага прыгнёту, разбурыла памешчыка і, увёўшы нэп, дапусьціла да існаваньня і росту капіталістычныя элемэнты.

Гэтая буржуазная ідэолёгія ў яе новай форме, у працэсе яе прыстасаваньня да ўмоў пролетарскай дыктатуры знаходзіць сваё мастацкае выяўленьне ў частцы творчасьці Янкі Купалы,

Якуба Коласа і Бядулі за час адстанаўленчага пэрыоду.

Няправільна, вядома было-б сьцьвярджаць, што толькі гэтая ідэолёгія формавала творчасьць названых пісьменьнікаў за час адстанаўленчага пэрыоду.

Рост соцыялістычных элемэнтаў у гаспадарцы, посьпехі ў будаўніцтве культуры нацыянальнай формай і пролетарскай зьместам, узмацненьне кіруючай ролі пролетарыяту ў культурна-нацыянальным будаўніцтве, рост пролетарскай літаратуры,—усё гэта жыватворча ўплывае і на Купалу, і на Коласа, і нават на Бядулю.

Творчасьць Купалы за адстанаўленчы пэрыод характарызуецца ня толькі творам „Безназоўнае“, які зьяўляецца вынікам і выяўленьнем ідэолёгіі буржуазна-нацыяналістычнай інтэлігенцыі, пераломленай праз дробнабуржуазную псыхіку поэта, але і творам „Арлянятам“, які зьяўляецца выяўленьнем уплыву пролетарыяту на Купалу, а таксама радам іншых твораў, у якіх Янка Купала адлюстроўвае агулам правільна процэсы, што адбіваліся ў часы адстанаўленчага пэрыоду. Узяць хоць-бы верш „Дзьве сястры“, напісаны ў 1924 г. Верш выяўляе ідэю саюзу рабочае клясы з сялянствам,

ускрываючы ўмовы жыцьця работніцы і сялянкі ў старыя часы.

Аўтар заклікае работніцу і сялянку:

„Годзе кісьнуць, марнець,
Песьні смутныя пець,—
Ладзіць новую час гаспадарку!
Казкі новыя ў сьвет,
Дум палаючых цьвет
Кінь, сялянка з сястрой пролетарскай!“

Ці верш „Летапісаньне,“ пісаны ў 1928 г. Ня гледзячы на яго недастатковую глыбіню, ён у асноўным правільна адлюстроўвае асобныя бакі працэсу нараджэньня БССР. Праўда, і ў гэтых вершах Купала яшчэ не пазбавіўся ўласьцівага яму ў ранейшых творах падыходу да об'ектаў сваёй творчасьці. Калі ён бярэ работніцу і сялянку, заклікае іх у саюзе будаваць новую гаспадарку, то з поля зроку поэта зьнікае кіруючая сіла ў гэтым саюзе (рабочая кляса, у тым ліку і работніца). Работніца і сялянка, паводле поэта, проста дзьве сястры,— як тая, так і другая раней жылі ў дрэнных умовах, а каб стварыць лепшыя ўмовы, трэба будаваць лепшую гаспадарку. А тое, што работніца ёсьць член кіруючай соцыялістычным будаўніцтвам рабочае клясы, гэта поэт адчуў

недастаткова. Верш „Летапісаньне“ зноў-жа хварэе на тое-ж самае. Поэт беларускаму народу супроцьстаўляе паляка наогул, расійца (таксама наогул).

Ня гледзячы на гэтыя недахопы, якія вынікаюць з сьветапогляду поэта, названыя вышэй творы зьяўляюцца конкрэтным выяўленьнем тэндэнцыі, якая зарадзілася ў творчасьці Купалы, з часу напісаньня ім вершу „На сьмерць Сьцяпана Булата“, прайшла праз „Арлянятам“, да вершу „Дзьве сястры“, а далей праз „Летапісаньне“, да твораў „Сыходзіш, вёска, з яснай явы“, „Дыктатура працы“, „А ў Вісьле плавае тапелец“ і інш. Гэтая тэндэнцыя—ёсьць набліжэньне творчасьці Купалы да актуальных проблем савецкай літаратуры ў пэрыод соцыялістычнага будаўніцтва, тэндэнцыя пераробкі, рэконструкцыі асноў творчасьці Янкі Купалы—яго сьветапогляду.

Але гэтая тэндэнцыя, як і ўсякая тэндэнцыя, так ці інакш у сваім разьвіцьці сустракае перашкоды і паслабляецца супроцьлеглымі элемэнтамі, яшчэ не аджыўшымі, старымі.

„Тэндэцыя,—піша Маркс у „Капітале“,—закон, абсолютное проявление которого задерживается, замедляется и ослабляется противодей-

ствуюшчымі обстоятельствами" („Капитал", т. III, ч. 1, стар. 215).

Разьвіцьцё творчасьці Купалы ў савецкі пэрыод адбываецца праз барацьбу здаровай тэндэнцыі з старым нацыяналістычным, якое пераважае пакуль што ў творчасьці Купалы за час савецкага пэрыоду. Так досыць часта здаровыя тэндэнцыі аслабляюцца, затрымліваюцца нацыяналізмам, буржуазна-адраджэнцкай ідэолёгіяй. Твор „Арлянятам" са здаровым зьместам аслабіўся ў свой час творам „Безназоўнае", а твор „Дзьве сястры"—глыбока ўпадніцкім вершам „У лесе", „Па Даўгінаўскім шляху", „Каб" і гэтак далей. Вершы „У лесе", „Па Даўгінаўскім шляху", „Каб" і рад іншых, напісаных пераважна ў 1926 г., носяць на сабе глыбокія сьляды буржуазна-нацыяналістычнай ідэолёгіі, якая формавала ў асноўным гэтыя творы, у барацьбе супроць пролетарскай ідэолёгіі, уплыў якой вызначае здаровую тэндэнцыю.

Апошнія творы Купалы сьведчаць, што поэт імкнецца выявіць свае вялізарныя творчыя здольнасьці і накіраваць іх на службу соцыялістычнаму будаўніцтву. Усе об'ектыўныя спрыяючыя ўмовы для гэтага навочны. Будзем спадзявацца, што зробленыя ім спробы зьяўля-

юцца асновай для інтэнсыўнай, высокаякаснай творчасьці, якая рэалізуе той лёзунг, які ўпісаны ў яго ліст у рэдакцыю газэты „Зьвязда“ ад 10-XII—30 г., ліст, які зьявіўся як вынік крытычна прагледжанага самім поэтам свайго шляху.

У якасьці заключэньня нашага нарысу мы лічым патрэбным прывесьці вытрымкі з названага лісту поэта, якія паказваюць здаровае імкненьне яго ўключыцца ў справу стварэньня літаратуры вартай нашай вялікай эпохі.

„На літаратурную ніву я ўступіў у 1905 г., надрукаваўшы свой першы верш „Мужык“. Мэта, якою ставіў я перад сваёй поэтычнай творчасьцю, гэта было паказаць у мастацкай форме ўсю беднату, цемнату, нядолю і паднявольле батрацтва і бядняцтва беларускае вёскі, якое горка пакутвала пад соцыяльным і нацыянальным гнётам крывавага царызму. Але пачаўшы з 1908 г., у часы самае чорнае рэакцыі, працаваць у „Нашай Ніве“, я падпаў пад ўплыў нашаніўскага дробнабуржуазнага і кулацкага нацыяналістычнага адраджанізму, захапіўся гэтымі адраджэнцкімі ідэямі нацыянал-дэмократычнай дзяржаўнасьці і пачаў іх адбіваць у сваей далейшай творчасьці, апяваючы,

як нешта цэлае, па-за клясавае, беларускі „народ“, ідэалізуючы ў некаторых сваіх творах гістарычнае мінулае, значыцца, фэўдальна-паншчыннае Беларусі, зацямняючы гэтым самым клясавую сутнасьць соцыяльнае і нацыянальнае барацьбы за вызваленьне, якая ў гэты пэрыод хоць прыдушана, але хвалявалася, узбуралася ў імкненьнях і парывах працоўных мас (нелегальная рэволюцыйная літаратура, забастоўкі і г. д.).

Гэтае захапленьне дробнабуржуазнымі нацыянал-дэмократычнымі ідэаламі прычынілася таму, што я і ў першыя гады Кастрычніцкае рэволюцыі ня змог ад іх пазбавіцца ды ўразумець і ўсьвядоміць усю веліч і гістарычную нямінучасьць пролетарскае рэволюцыі, якая адна несла сапраўднае соцыяльнае і нацыянальнае вызваленьне працоўным былой царскай Расіі, у тым ліку і Бел[illegible] Дзякуючы гэтаму майму асьляпленьню, зьявіліся мае такія творы з ярка нацыянал-дэмократычнымі настроямі, як, напрыклад, „Паўстань“, „Перад будучынай“, п‘еса „Тутэйшыя“ і інш...

Прасякнуты нацыянал-дэмократычнай заразай, прышчэпленай мне нашаніўскім пэрыодам маёй літаратурнай працы, калі я стаў быў адным

з ідэолёгаў буржуазна-дэмократычнага „адраджэнцтва“ і „незалежніцтва“, я і пасьля Кастрычніцкае рэволюцыі не адмежаваўся, як гэта належала, ад акружаючага мяне нацыянал-дэмократычнага асяродзішча, а быў уцягнут ім і прыняў самы блізкі ўдзел у контррэволюцыйнай рабоце віднейшых беларускіх нацыянал-дэмократаў, якія на грунце конституцыі Савецкае Беларусі, скарыстаўшы давер'е, якое аказана было ім з боку савецкай улады, прыкрываючыся хлусьлівай заслонай фальшывых крывадушных дэкляарацый і запэўненьнем, праводзілі свае шкодніцкія нацыянал-дэмократычныя ідэі на культурным фронце.

Працуючы ў навукова-тэрміналёгічнай комісіі у Інбелкульце, БАН, гэтых кіруючых штабах беларускага нацыянал-дэмократызму, бачачы сваімі вачыма іхнія несумяшчальныя з інтарэсамі беларускіх працоўных мас і запатрабаваньнямі партыі і савецкае ўлады ўстаноўкі і мерапрыемствы ў культурным будаўніцтве, я ня толькі ні разу не асудзіў іх, але, наадварот, моральна падтрымліваў і дапамагаў іх рэалізацыі.

Але гэты этап пройдзены. Цяпер я бачу ўсю шкоднасьць і гібельнасьць таго шляху, па якім

памыкаліся беларускія нацыянал-дэмократы павярнуць ход гісторыі. Гіганцкімі крокамі ідзе культурнае і экономічнае будаўніцтва Беларусі. Краіна, быўшая ўвасабленьнем рабства, убоства і беспрасьветнай цемры, ператвараецца ў краіну вольнае працы. На месцы некалі гнілых дрыгвяных балот вырастаюць фабрыкі, заводы, электрастанцыі. На месцы ўбогіх сялянскіх палосак красуюцца колгасныя нівы, навейшыя дасягненьні аграноміі, тэхнікі і пладатворчай колектыўнай працы. На месцы народнай цемры вырастаюць бязупынна ўсё новыя і новыя культурныя, навуковыя і навучальныя ўстановы.

Будуецца соцыялізм.

... Парываючы сам катэгорычна і беспаваротна ідэйна і організацыйна з беларускім нацыянал-дэмократызмам, як з нейкай хваробліваі зданьню, якая палоніла мяне на працягу доўгіх год майго сьвядомага жыцьця, я шчыра жадаю, каб гэты мой горкі вопыт паслужыў навукай для тэй часткі беларускай інтэлігенцыі, якая яшчэ ня зусім вызвалілася ад нацыянал-дэмократычнага шалупіньня, якая канчаткова ня прышла да пераканаьня, што толькі працуючы пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, гэтага авангарду рабочае клясы, толькі аддаючы свае сілы

на соцыялістычнае будаўніцтва, яна ня будзе адмецена жыцьцём як агідная памятка рабскага мінулага.

Усе сілы—соцыялістычнаму будаўніцтву на зацьвітаючай новымі агняцьветнымі краскамі індустрыяльна-колгаснай глебе Савецкай Соцыялістычнай Беларусі!“

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК
СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

| | |
|---|---|
| АПОШНІ ЗЬВЕРЫЯДАВЕЦ<br>Стар. 152 | М. ЛЫНЬКОЎ<br>Цана 90 кап. |
| АНДРЭЙ ЛЯТУН<br>Стар. 244 | М. ЛЫНЬКОЎ<br>Цана 1 руб. |
| ХВЯДОС ЧЫРВОНЫ НОС<br>Стар. 52 | КРАПІВА<br>Цана 1 р. 55 к. |
| СУСТРЭЧА<br>Стар. 188 | РЫГОР ЭПІК<br>Цана 30 кап. |
| ВУРКАГАНЫ<br>Стар. 412 | І. МІКІТЭНКА<br>Цана 1 р. 75 к. |
| ВІНАВАТЫ<br>Стар. 144 | ГАЛАВАЧ<br>Цана 60 кап. |

КНІЖКІ ПРАДАЮЦЦА ВА УСІХ КНІГАРНЯХ ДВБ,
СПАЖЫЎКООПЭРАЦЫІ І САЮЗДРУКУ

1964 г.

Бел. аддзел
1994 г.

ЦАНА 70 кап.

Пераплёт 12 к.

B000000272113